КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 38 (214) ◂ 22 кастрычніка ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



## КАНВЕЕР СМЕРЦІ
Стар. 6

## БЫЛО Б КАМУ ЕСЦІ
Лічыцца, што здатныя на многае беларусы асаблівых поспехаў дасягаюць у вырошчванні бульбы. Як і амаль кожны міф, гэты выкарыстоўваецца ўладай для доказу сваёй еднасці з народам
Стар. 5

## АФРЫКАНСКАЕ ПРЫДНЯСТРОЎЕ
У непрызнанай міжнародным грамадствам афрыканскай краіне Самалілэнд па выніках выбараў адбылася мірная перадача ўлады апазіцыі. Выпадак для афрыканскіх шыротаў незвычайны
Стар. 13

## «ВАЎКІ»: УЦЁКІ З БЕЛАРУСКАЙ ЗОНЫ
Стар. 14

ЧЫТАЙЦЕ
Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

## НАРАЧ: ПАГРОЗА МАДЭРНІЗАЦЫІ
Нарыс Вольгі Хвоін

З НАГОДЫ

# ПАСОЛ ДОБРАЙ ВОЛІ

Вольга ХВОІН

**У Мінск у разгар передвыбарчай кампаніі прыляцела лідэр суседняй дзяржавы. Дзяржавы — сябра ЕС, дзяржавы, якая актыўна падтрымлівае беларускую апазіцыю, і якая, відавочна, не супраць наводзіць эканамічныя масты з Беларуссю пад кіраўніцтвам Лукашэнкі.**




Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ прыбыла ў Мінск з рабочым візітам. Прымаючы спадарыню Грыбаўскайтэ, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што дзяржавы-суседкі маюць агульныя праблемы: «Мы з вамі знаходзімся ў неспрыяльным становішчы. Трэба думаць, як нам забяспечваць сваю незалежнасць». Традыцыйна незалежнасць у Беларусі завязана на энерганосьбіты. Варыянты выкарыстання порту ў Клайпедзе для перавалкі венесуэльскай нафты і транспарціроўкі беларускіх калійных угнаенняў абмяркоўваліся раней.

Тым больш, што транспартнае супрацоўніцтва з Літвой актуальнае, бо не так даўно Беларусь наведваў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес. У выніку было падпісанае пагадненне на пастаўку 30 мільёнаў тон нафты на працягу наступных трох гадоў.

Пра транзіт венесуэльскай нафты Беларусь і Літва дамовіліся яшчэ на пачатку кастрычніка. Гендырэктар «*Klaipedos nafta*» Рокас Масюліс заявіў, што цягам года плануецца перавезці прыкладна 2,5 мільёна тон нафты. «Да канца кастрычніка нашы гаспадарчыя суб'екты і Літоўская чыгунка падпішуць дамовы, па якіх са снежня цягам двух гадоў мы транспартуем не менш за 2,5 мільёна тон нафты праз Клайпедскі порт па чыгунках Літвы і Беларусі на нашы нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы», — паведамляў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка.

Год таму Аляксандр Лукашэнка сустракаўся ў Вільне са спадарыняй Грыбаўскайтэ, пасля чаго сказаў, што «вельмі задаволены» перамовамі з прэзідэнтам Літвы і што палітыкі «аб усім дамовіліся». Перамовы ў Мінску таксама прайшлі на пазітыўнай ноце. Лукашэнка зазначыў, што Беларусь і Літва дэманструюць добрую дынаміку тавараабароту, таму ёсць магчымасць выйсці ў 2011 годзе на 1 мільярд долараў. У мінулым годзе двухбаковы тавараварот склаў 565,6 мільёна долараў, або 66,3% да ўзроўню 2008 года. У Беларусі функцыянуюць 410 прадпрыемстваў з удзелам літоўскага капіталу, а ў Літве — больш за 200 прадпрыемстваў з удзелам беларускага.

Далю Грыбаўскайтэ ў колах апазіцыі пачалі папракаць за гэты візіт — маўляў, падтрымлівае Лукашэнку ў вырашальныя часы. Але прэзідэнт Літвы не праігнаравала і агульнаеўрапейскія каштоўнасці. Яна нагадала, што ў наступным годзе Літва будзе старшынстваваць у АБСЕ. «У гэтых рамках мы хочам дапамагчы Беларусі, быць побач падчас выбараў, дапамагчы быць больш адкрытай і прызнанай у Еўропе, — сказала спадарыня Грыбаўскайтэ. — Літва гатовая супрацоўнічаць і абараняць інтарэсы Беларусі ў Еўрасаюзе настолькі, наколькі Беларусь будзе гэтага хацець».

Еўрапейскі саюз адышоў ад палітыкі ізаляцыі, дык, адпаведна, еўракамісары цешацца надзеяй, што нават невялікія крокі ў бок дыялогу з рэжымам Лукашэнкі будуць мець пазітыўны вынік. Аглядальнік Раман Якаўлеўскі гаворыць, што гэты візіт для многіх быў нечаканы. «Безумоўна, ініцыятыва належыць не толькі Вільне, згоду даў і Брусель, то бок мае месца скаардынаваная палітыка. Фактычна гэты візіт ёсць выказваннем падтрымкі Аляксандру Лукашэнку. Цікава, што Літоўская Рэспубліка мае ўплывовы парламент, але яго голас мы не пачулі на гэты конт, што выклікае пэўныя непаразуменні», — лічыць эксперт.

Важна, што спадарыня Грыбаўскайтэ і міністр замежных справаў Літвы Аўдроніс Ажубаліс сустрэліся і з прадстаўнікамі апазіцыі, цяперашнімі патэнцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты — Рыгорам Кастусёвым, Яраславам Раманчуком, Уладзімірам Някляевым, Андрэем Саннікавым, Віталем Рымашэўскім. Падчас сустрэчы Даля Грыбаўскайтэ сказала, што выказала Аляксандру Лукашэнку занепакоенасць ходам прэзідэнцкай кампаніі, спадзяванні, што выбары будуць празрыстыя і дэмакратычныя з допускам беларускіх і замежных назіральнікаў да падліку галасоў. Літоўскіх палітыкаў цікавіла і перспектыва аб'яднання беларускіх кандыдатаў у прэзідэнты, на што быў адказ — пасля рэгістрацыі будзе сустрэча дзеля абмеркавання такой магчымасці.

Ці не важнейшы вынік візіту літоўскай дэлегацыі — падпісанне дамовы аб парадку ўзаемных паездак жыхароў памежных тэрыторый Беларусі і Літвы. Жыхары памежных тэрыторый нарэшце змогуць перасякаць мяжу і знаходзіцца на памежнай тэрыторыі іншай дзяржавы з адмысловым дазволам на руках на адлегласці да 50 кіламетраў ад мяжы цягам 90 дзён у паўгода. Правы на працу гэтыя дазволы не даюць, але мара адкрытага Еўрасаюзу для многіх будзе бліжэй.

Раман Якаўлеўскі падпісанне дамовы называе «добрым знакам», але гаворыць, што пытанне таго, як рэальна запрацуе дамоўленасць, застаецца адкрытым. «Я хачу нагадаць, што пасля падпісання неабходна ратыфікацыя дакументу парламентам, а затым мусіць быць рэзалюцыя прэзідэнтаў. Мяркую, што ў літоўскім парламенце будуць дэбаты на гэтую тэму. Да слова, падобныя пагадненні ляжаць на сталах у беларускіх чыноўнікаў, але тычацца яны Польшчы і Латвіі. Увогуле, я б сказаў, што гэты паварот з перасячэннем беларуска-літоўскай мяжы сведчыць пра тое, што ёсць эфектыўная і таямнічая дыпламатыя беларускага МЗС, бо пытанне падвісла амаль на год, а пасля так нечакана было вырашана», — каменту падпісанне дакументу аглядальнік Якаўлеўскі.




▸ БІЗНЕС

# ДЗЯРЖАВА ЧАКАЕ

Вольга ХВОІН

**Да прэзідэнцкіх выбараў плануецца прыняць дырэктыву аб лібералізацыі эканамічнай дзейнасці. Пра гэта паведаміў намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур.**

Праект дырэктывы № 4 аб далейшай лібералізацыі эканомікі і разняволенні прадпрымальніцкай ініцыятывы цяпер знаходзіцца на разглядзе ўрада. Бліжэйшым часам праект будзе дапрацаваны і затым накіраваны ў Адміністрацыю прэзідэнта. Тур назваў дырэктыву палітычным дакументам, які вызначае стратэгію дзейнасці дзяржавы.

У праект уключаныя як прынцыпова новыя для беларускага заканадаўства нормы, так і «ўказанне на неабходнасць актывізацыі ўжо замацаваных нарматыўных актаў і дзеянняў у дачыненні да суб'ектаў гаспадарання».

Таксама да канца бягучага года будзе падрыхтаваны праект закона аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Гэты законапраект дазволіць замацаваць неабходнасць і прыярытэтнасць узаемавыгадных кантактаў з прыватным сектарам, аб'яднае ўсе ключавыя моманты, звязаныя з рэалізацыяй такога партнёрства. Паралельна ў краіне распрацоўваецца шэраг іншых дакументаў, накіраваных на стварэнне спрыяльных умоў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

Пастаўлена задача да канца 2015 года давесці долю прыватнага сектару ў ВУП да адной трэцяй. Цяпер яна складае прыкладна дзясятую частку. «Важна, колькі малы і сярэдні бізнес будуць даваць прыбытку на чалавека. Калі напрыканцы пяцігодкі мы выйдзем на 50 тысяч долараў на аднаго занятага чалавека і на павелічэнне долі малога і сярэдняга бізнесу ў эканоміцы, гэта будзе вельмі добра», — зазначыў Тур.

Нагадаў Андрэй Тур і пра намер кіраўніцтва Беларусі ўвайсці ў лік першых трыццаці краін у рэйтынгу Сусветнага банку Doing Business. Дырэктыва №4 і падрыхтаваны праект плану мерапрыемстваў на 2010–2011 гады па паляпшэнні ўмоў для вядзення бізнесу мусяць дапамагчы забяспечыць высокае месца Беларусі ў рэйтынгу Сусветнага банка. Бліжэйшая ацэнка будзе давацца па выніках зроблenага да 1 красавіка 2011 года, а па пазіцыі «Падаткаабкладанне» (слабае месца Беларусі) — да 1 студзеня.

Чыноўнік не адмаўляе таго, што эканамічны крызіс падкасіў фінансавыя справы Беларусі, аднак ён не адмовіў і таго, што з 1 студзеня 2011 года ў краіне зноў будзе падвышана мінімальная заработная плата да 450 тысяч рублёў. З 1 лістапада бягучага года яна ўсталявана ў памеры 400 тысяч рублёў. «Пакуль гэтыя планы захоўваюцца. Паглядзім, як паўплывае на макраэканамічную сітуацыю рост тарыфнай стаўкі першага разраду з 1 лістапада 2010 года», — сказаў Андрэй Тур. Разважаючы пра мэтазгоднасць падвышэння заробку, ён нагадаў, што летась Беларусь, у адпаведнасці з рэкамендацыямі Міжнароднага валютнага фонду, абмежавала рост заработнай платы.

▸ ВЫБАРЫ

# ЛЯБЕДЗЬКА ЗВЯРНУЎСЯ Ў ГЕНПРАКУРАТУРУ

Генадзь КЕСНЕР

**Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька накіраваў чарговы зварот на імя Генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча.**

Зварот звязаны з публікацыяй у недзяржаўнай газеце «Народная воля» інтэрв'ю з падпалкоўнікам міліцыі ў запасе Мікалаем Казловым, які засведчыў грубыя парушэнні выбарчага заканадаўства падчас апошніх парламенцкіх выбараў, якія прайшлі ў 2008 годзе. Пра гэта лідэр АГП паведаміў на прэс-канферэнцыі.

Нагадаем, што на той час дзейсны падпалкоўнік міліцыі 27 верасня 2008 года стаў сведкам масавага ўкідвання ў скрыню для галасавання бюлетэняў падчас датэрміновага галасавання на выбарчым участку № 463 Старавіленскай выбарчай акругі № 105 у Мінску, дзе адным з кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў быў Анатоль Лябедзька.

«Дадзеная публікацыя, з майго пераканання, патрабуе захадаў пракурорскага рэагавання, — адзначае ў сваім звароце старшыня АГП. — У дадатак да выкладзенага паведамляю, што мной як кандыдатам у дэпутаты па Старавіленскай выбарчай акрузе ў кастрычніку 2008 года быў накіраваны зварот у ЦВК аб ануляванні вынікаў галасавання ў сувязі са шматлікімі парушэннямі. Аднак па дадзеным звароце ніхто ніякага расследавання не праводзіў».

Па словах Анатоля Лябедзькі, падстаў для завядзення крымінальнай справы ў Генпракуратуры дастаткова.

Падпалкоўнік міліцыі ў запасе Мікалай Казлоў, які шмат часу адпрацаваў у крымінальным вышуку, перакананы: «Для таго, каб у гэтай сітуацыі высветліць усё да апошняга руху цела, патрабуецца вельмі мала часу, бо ўсе дзеянні ажыццяўляліся не дасведчанымі злачынцамі-крымінальнікамі, а звычайнымі людзьмі, імёны якіх вядомыя. Гэта вельмі проста, галоўнае — было б жаданне», — падкрэсліў Мікалай Казлоў.

Лябедзька паведаміў, што апошнім часам да яго звярнуліся два старшыні ўчастковых камісій з рэгіёнаў. «Абодва сказалі: мы пакуль знаходзімся на службе, але ў нас ёсць пачкі бюлетэняў, якія ўкідвалі. То бок, гэта не мінская, а агульнабеларуская з'ява», — рэзюмаваў кіраўнік АГП.

«Я мяркую звярнуцца да дэпутата Самасейкі (былы канкурэнтам А. Лябедзькі на парламенцкіх выбарах) з заклікам пакласці на стол мандат, які не быў атрыманы ад выбаршчыкаў Старавіленскай акругі, а папросту скрадзены. У нармальнай дзяржаве пасля такіх выкрыванняў любы парламентарый павінен быў бы сам звярнуцца ў пракуратуру з просьбай правесці расследаванне і скласці з сябе паўнамоцтвы, пакуль гэта расследаванне не завершыцца», — адзначыў Лябедзька.

▸ ЗАЯВА

# СПЫНІЦЬ ПЕРАСЛЕД!

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Студэнцкае прадстаўніцтва ЕГУ і Моладзевая ініцыятыва StudAlliance выказваюць заклапочанасць сітуацыяй, якая склалася вакол студэнта ЕГУ Мікалая Дзядка.**

Мікалай Дзядок, студэнт 2 курса завочнай формы навучання ЕГУ, ужо больш за месяц утрымліваецца ў СІЗА–1 Мінска. Неабгрунтаваныя абвінавачанні не могуць не выклікаць занепакоенасці яго далейшым лёсам.

Хлопец быў затрыманы 3 верасня 2010 года ў якасці падазронага па справе «Аб нападзе на амбасаду Расійскай Федэрацыі».

Не сабраўшы дастатковай колькасці доказаў, тэрмін ўтрымання Мікалая працягнулі па іншай справе — «Аб нападзе на Дом прафсаюзаў».

Аднак калі абвінавачанне і па другім правапарушэнні не набыло належнай падставы, Мікалай быў затрыманы як падазроны па справе «Аб нападзе на аддзяленне «Беларусбанка».

Праз больш як 20 сутак арышту, Мікалай быў абвінавачаны ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі ля Генштаба Беларусі, і 1 кастрычніка яму было прад'яўлена абвінавачанне па частцы 2 артыкула 339 — «хуліганства».

Прадстаўнікі студэнцкай супольнасці ЕГУ прынялі адпаведную заяву, дзе сказана: «Мы рашуча выступаем супраць варварскіх, абсурдных метадаў працы беларускіх спецслужбаў і праваахоўных органаў. Мы заклікаем студэнцкую супольнасць Беларусі, незалежныя моладзевыя арганізацыі, беларускіх праваабаронцаў, а таксама ўсіх, хто занепакоены беспярэчнай самаўпраўнасцю і беззаконнем, што пануюць у беларускіх сілавых ведамствах, праявіць салідарнасць ва ўсеагульнай маральнай падтрымцы Мікалая Дзядка, далучыцца да патрабавання неадкладна вызваліць яго з-за кратаў і спыніць пераслед грамадска актыўнай моладзі».

▸ ВЫСТАВА

# ПРАЗ РЭХА ЦІШЫНІ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава дзіцячых карцін «Рэха цішыні». У жыцці іх аўтараў, выхаванцаў творчай майстэрні «Фарба», няма гукаў. Гэта дзеці з цяжкімі парушэннямі слыху. Свой унутраны свет і пачуцці яны ўвасобілі ў маляўнічых вобразах.**

Разам з малюнкамі на выставе прадстаўлены і фотаздымкі іх аўтараў, якія зрабіла Марына Бацюкова. Яна паказала юных мастакоў у звыклай для іх абстаноўцы, падчас творчай працы і зносін паміж сабой. Перапэцканых фарбамі, задумлівых, радасных, здзіўленых, гарэзлівых.

У карцінах дзяцей пераважае абстрактны жывапіс. І, як лічаць адмыслоўцы, гэта не толькі таму, што кіраўнік майстэрні «Фарба» Дзмітрый Ярмілаў з'яўляецца прыхільнікам наватарскага мастацтва. Але ў саміх дзяцей ёсць цяга да абстрактнага жывапісу, які ім бліжэй. Як адчуваюць, так яны і адлюстроўваюць. І актыўна выкарыстоўваюць святло і экспрэсію ў сваёй творчасці. «Я думаю, Ярмілаў таксама нездарма задае ім менавіта гэтую галіну накіраванасці», — лічыць куратар праекта Наталля Сяліцкая.

Творчая майстэрня «Фарба» існуе пры мінскай спецыяльнай школе № 14 для дзяцей з цяжкімі парушэннямі слыху. «Магчыма, — кажа куратар праекта мастацтвазнаўца Наталля Сяліцкая, — творчасць ім унутры дапамагае». Акрамя асноўнай, мастацкай задачы, ініцыятары выставы хацелі сваім праектам стварыць культурную прастору, у якой бы гэты дзеці камфортна сябе адчувалі. І маглі самарэалізавацца адэкватна сваім магчымасцям. «У гэтым праекце ёсць і мастацкія вартасці, і сацыяльныя асновы. Таму мы зараз бярэм тэндэнцыю рабіць сацыяльна-мастацкія праекты, дзе ёсць і тое, і другое», — зазначыла Сяліцкая.

У Нацыянальным мастацкім музеі гэта ўжо другая падобная выстава. У 2005 годзе пад назвай «Свет іншымі вачыма» дэманстравалася экспазіцыя выхаванцаў гэтай жа творчай майстэрні. Выстава «Рэха цішыні» будзе праходзіць да 27 кастрычніка.



## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ТОЛЬКІ СПАКОЙ!

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Пакуль прэтэндэнты ў прэзідэнты распіхваюць адзін аднаго ў барацьбе за кандыдацтва, Аляксандр Лукашэнка дэманструе дзіўны спакой. Быццам «навапасіту» з'еў. Здаецца, да яго дайшло пасланне Крамля, дасланае яму праз Нарышкіна і беларускіх журналістаў: «Вярніся, я ўсё дарую!» Нават пытанне выбараў, паднятае падчас візіту прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ, яго, здаецца, слаба закранула.**

«Беларусь імкнецца да таго, каб пасля выбараў ніхто пальцам на нас не паказваў. Дзейнаму прэзідэнту гэта зусім не трэба», — заявіў Аляксандр Лукашэнка на прэс-канферэнцыі па выніках перамоў з прэзідэнтам Літвы Даляй Грыбаўскайтэ 20 кастрычніка.

Беларусі, падкрэсліў Лукашэнка, неабходна, каб «гэтыя выбары прайшлі не горш, чым папярэднія». «Хаця не ведаю, якія прэтэнзіі могуць быць да тых», — дадаў ён. «Наша прамая зацікаўленасць у тым, каб зарэгістравалі ўсіх кандыдатаў», — заявіў прэзідэнт.

Як паведаміла сама Даля Грыбаўскайтэ, у ходзе перамоў Аляксандр Лукашэнка паабяцаў ёй, што будуць зарэгістраваныя ўсе кандыдаты і што на выбарах будуць прысутнічаць назіральнікі.

Што-што, а «дэманстраваць» у нас умеюць, але гэта цалкам не азначае таго, што выбары будуць сапраўды празрыстымі і дэмакратычнымі.

Тым часам, яшчэ адзін апазіцыйны прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду пераадолеў бар'ер у сто тысяч подпісаў, каб быць зарэгістраваным кандыдатам. Як паведаміў лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, за яго нага намесніка на партыйнай пасадзе Ярослава Раманчука на 20 кастрычніка сабрана 102590 подпісаў. «Гэта без уліку зборшчыкаў подпісаў, якія не прывязаныя ні да якіх каардынатараў. Яны збіраюць подпісы самі, а потым папросту прыносяць да нас у штаб, не паведамляючы, колькі яны сабралі», — адзначыў Лябедзька.

Тым часам, супраць Раманчука ўзняўся намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур. Адказваючы на пытанні журналістаў 20 кастрычніка на прэс-канферэнцыі ў Мінску, ён назваў праект эканамічнай праграмы Раманчука «экстрэмісцкім».

Многія прапановы Раманчука закладзены і ў праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2015 года, зазначыў Тур. Але ён і паведаміў, што «Раманчук з'яўляецца прыхільнікам выключна ліберальнага тыпу эканомікі. Ён узначальвае Цэнтр Мізеса, а Мізес — чалавек з плеяды архінеалібералаў, у якіх дзяржава не прысутнічае практычна нідзе, яна з'яўляецца тормазам і перашкаджае развіццю эканомікі», — заявіў намеснік міністра.

«Усе неаліберальныя праграмы носяць экстрэмісцкі характар, якія праяўляецца ў тым, што асобныя палажэнні вядуць да выключэння або супярэчнасці адно да аднаго», — заявіў чыноўнік. Ён прывёў прыклад з праграмы Раманчука, дзе немагчыма адначасова скараціць значную долю падаткаабкладання або сацыяльнага падатку і павысіць пенсіі. «Раманчук ніколі не працаваў у органах дзяржкіравання і не мае базавай эканамічнай адукацыі. Гэта не азначае, што ён не можа разбірацца ў эканоміцы. У яго не было магчымасці паўдзельнічаць у выпрацоўцы сапраўдных рашэнняў, і ў гэтай частцы праграма вельмі экстрэмісцкая», — заключыў Тур.

Так і хацелася б нагадаць пра тое, што чыя б карова мычала, а чыя б нервова паліла ўбаку. Бо, што тычыцца нашай эканомікі, то яна знаходзіцца, хутчэй, у перадсмяротным стане. І найперш людзей хвалююць эканамічныя пытанні, што бачна па іх паводзінах на пікетах па зборы подпісаў. Усе адчуваюць, што сканание «беларускага эканамічнага цуду» на падыходзе, а намесніку міністра эканомікі няма чым больш заняцца, чым глядзець на праграму Раманчука.

Аптымістычным выдаўся тыдзень і для другога «стотысячніка» Уладзіміра Някляева. 19 кастрычніка суддзя Кірыл Палулех прызнаў актывіста кампаніі «Гавары праўду!», якую ачольвае Някляеў, паэта Міхаіла Башуру вінаватым на падставе дзвюх частак артыкула 380 Крымінальнага кодэкса (падробка, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў). Актывіст апазіцыі абвінавачваўся ў тым, што для атрымання льготнага крэдыту на будаўніцтва кватэры ён падаў падробленую даведку аб даходах. З 6 жніўня Башура знаходзіўся пад вартай у розных следчых ізалятарах.

Названы артыкул прадугледжвае пакаранне да трох гадоў пазбаўлення волі. Дзяржаўны абвінаваўца Галіна Корнева прасіла прыгаварыць Башуру да шасці месяцаў арышту. Аднак суддзя Кірыл Палулех прызначыў пакаранне Башуры ў выглядзе штрафу ў 500 базавых велічынь (17,5 мільёна рублёў). Актывіст апазіцыі быў вызвалены з-пад варты ў зале суда.

Здавалася б, чалавек выйшаў на волю пасля амаль двух з паловай месяцаў зняволення. Што яму яшчэ трэба? Дык не. Башура нават мае намер абскардзіць рашэнне суда Савецкага раёна Мінска! «Мы абмяркавалі з адвакатам сітуацыю і вырашылі падаваць касацыйную скаргу. Рэч нават не ў штрафе, а ў тым, што мая віна лічыцца судом даказанай», — сказаў Башура.

Вось ужо сапраўды чалавек захацеў казаць праўду да канца!

Не спяць і іншыя ўдзельнікі выбараў. Кампанія «За справядлівыя выбары», якую праводзяць больш за дзесяць дэмакратычных партый і аб'яднанняў, мае намер ахапіць 250 участкаў для галасавання кругласутачным назіраннем. Пра гэта паведаміў 19 кастрычніка на прэс-канферэнцыі ў Мінску адзін з каардынатараў кампаніі намеснік старшыні руху «За Свабоду» Віктар Карнеенка.

Паводле яго слоў, на кожны з такіх участкаў плануецца накіраваць па чатыры назіральнікі. «Гэтага дастаткова, каб зрабіць добры аналіз працэсу галасавання і падліку галасоў», — сказаў Карнеенка.

Вось, пэўна, Карнеенка і распавядзе Грыбаўскайтэ пра тое, якія ў Беларусі выбары.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР ПРАВАЛЬСКІ



Якія выбары без сенсацый і інтрыг? Вось і прэтэндэнт у кандыдаты на пасаду прэзідэнта прадпрымальнік з Віцебска Уладзімір Правальскі заявіў, што яго брата Юрыя выкралі міліцыянты.

Калі Юрый Правальскі вяртаўся з працы 15 кастрычніка, то на вуліцы да яго пад'ехала машына, з яе вышлі чатыры супрацоўніка міліцыі, без тлумачэння затрымалі і адвезлі ў Першамайскі РАУС Віцебска.

«У вечар затрымання нам удалося высветліць толькі тое, што брат у Першамайскім РАУСе. Прычын затрымання нам ніхто не назваў, і наогул супрацоўнікі райаддзела заявілі, што Юрыя ўжо павезлі ў ізалятар часовага ўтрымання. Мы накіраваліся туды, але там брата не было. Вярнуліся ў райаддзел. Я напісаў скаргу на імя начальніка: чаму нас ашукваюць і не гавораць, што здарылася. Назаўтра, у суботу, мы зноў прыехалі ў міліцыю. І тут мне пашанцавала: я ўбачыў Юрыя, якога кудысьці вялі, і ён паспеў крыкнуць, што яму хочуць зрабіць укол», — цытуе Уладзіміра Правальскага БелаПАН. Патэнцыйны кандыдат звярнуўся ў незалежныя СМІ, і тады Юрыя адпусцілі.

Уладзімір Правальскі мяркуе, што гэта таямнічая справа рабілася, каб стварыць перашкоды для збору подпісаў за вылучэнне яго кандыдатам на пасаду прэзідэнта.

«Мае сваякі — сябры маёй ініцыятыўнай групы. І замест таго, каб збіраць подпісы, што асабліва эфектыўна ў выхадныя, мы павінны былі суткі займацца пошукамі Юрыя. Ён распавёў, што ў міліцыі на яго не склалі ні аднаго пратаколу і нават не растлумачылі, чаму затрымалі. Я падаю заяву ў Генеральную пракуратуру, бо лічу, што гэта была антызаконная спроба перашкодзіць асобе, якая вылучаецца на пасаду прэзідэнта», — гаворыць Уладзімір Правальскі.

### СЯРГЕЙ КАЛЯКІН



Кіраўнік беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін у выбарах у якасці прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта не ўдзельнічае, але мае намер вывесці «на чыстую ваду» тых, хто махлюе і парушае заканадаўства падчас правядзення электаральнай кампаніі. Сяргей Калякін цяпер з'яўляецца сустаршынёй кампаніі «За свабодныя выбары», і ўжо накіраваў у Цэнтрвыбаркам заяву аб парушэннях ініцыятыўнай групы Аляксандра Лукашэнкі. У заяве пералічаныя канкрэтныя выпадкі, калі подпісы за дзейснага кіраўніка Беларусі збіралі не сябры ініцыятыўнай групы, а таксама прыводзяцца факты ўдзелу адміністрацый розных арганізацый у зборы подпісаў.

Кампанія «За свабодныя выбары» таксама накіравала ў ЦВК за подпісамі патэнцыйных кандыдатаў — Рыгора Кастусёва, Алеся Міхалевіча, Віталя Рымашэўскага, Уладзімера Някляева і Яраслава Раманчука — праект шасці пастаноў, якія ЦВК варта было б прыняць, каб забяспечыць празрыстыя і справядлівыя выбары.

У кампанію «За свабодныя выбары» ўваходзяць 14 розных аб'яднанняў, яе падтрымліваюць ініцыятыўныя групы апазіцыйных кандыдатаў. Кампанія мае намер ахапіць 250 участкаў для галасавання кругласутачным назіраннем.

### АЛЕСЬ ШАТЭРНІК



Скульптар, жывапісец, сябра мастакоўскай суполкі «Пагоня» Алесь Шатэрнік адзначае сямідзесяціґоддзе. Ён вядомы найперш як аўтар помнікаў гістарычным асобам Беларусі — Рагнедзе, Тадэвушу Касцюшку, Усяславу Чарадзею, знакамітага Звана Свабоды. Яго творы знаходзяцца ў музеях Беларусі, Траццякоўскай галерэі ў Маскве, у Белым Доме (Вашынгтон, ЗША), у прыватных зборах Італіі, Францыі, Польшчы. Разам з тым шэраг мемарыяльных шыльды для будынкаў, дзе была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка, дзе працавала першая навуковая ўстанова краіны Інбелкульт, Звон Свабоды ды іншы плён працы Алеся Шатэрніка знаходзяцца ў майстэрні, а не ў гарадскім ландшафце. Мара Шатэрніка — убачыць у цэнтры Мінску галоўны твор свайго жыцця — скульптурную кампазіцыю, якая адлюструе шлях Беларусі да незалежнасці.

Цяпер у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры працуе выстава Алеся Шатэрніка «Сонцапрамень. Жывапіс. Скульптура. Імпрэсія». Гэта збор твораў, што адлюстроўваюць краявіды ваколіц малой Радзімы мастака ў Вайшкунах, што на паўночным захадзе Беларусі, замалёўкі з турыстычных вандровак. Ёсць і скульптурныя працы — Кірыла Тураўскі, Князь Вітаўт, Дунін Марцінкевіч. Выстава прымеркаваная да 70-годдзя аўтара.

▸ ВЫБАРЫ

# ШАНС ПАКАЯННЯ

Аляксей ХАДЫКА

**Алесь Міхалевіч, адзін з кандыдатаў у кандыдаты на прэзідэнцкія выбары, днямі зрабіў цікавую заяву. Па яго словах, у выпадку, калі яго абяруць прэзідэнтам, першым сваім дэкрэтам ён гарантуе свайму папярэдніку персанальную недатыкальнасць.**

Сярод каментараў заявы ў інтэрнэце прагучаў наступны тэзіс: з аднаго пункту гледжання, гарантыя недатыкальнасці для сыходзячага прэзідэнта добрая. А менавіта, засцерагаючы яго ад хуткага неправавога ўздзеяння з боку, яна дазволіць плаўна перадаць «былога» ў справядлівыя рукі закону, паводле якога і будуць ацэнены ўсе яго заслугі.

А заслуг нямала. У №№162–163 «Народнай волі» за 15–18 кастрычніка 2010 годзе з'явіўся розгаласны матэрыял Марыі Эйсмант пра былога падпалкоўніка міліцыі Мікалая Казлова, які на парламенцкіх выбарах 2008 года на ўчастку №463 Старавіленскай акругі №105 у Мінску зафіксаваў укідванне ўчастковай камісіяй пачка фальшывых бюлетэняў у апошні дзень папярэдняга галасавання. Вынік: падпалкоўнік сышоў у адстаўку, парушальнікі закона не пакараны.

З нагоды гэтай публікацыі хацеў бы выказаць дзве рэчы. Па-першае, перакананы, для парушальнікаў выбарчага заканадаўства адбылася толькі адтэрміноўка пакарання ў часе. Яны павінны разумець, што сустрэча з законам іх чакае непазбежна.

Па-другое, распавесці пра падобны выпадак, зафіксаваны на практыцы майго ўласнага назірання за мясцовымі выбарамі 2010 года, з тым, каб заклікаць чытачоў дакументаваць вядомыя ім выпадкі парушэння правапарадку. Для будучыні. І каб не здавалася, што апісаная Мікалаем Казловым сітуацыя ўнікальная. Ёсць адчуванне, што колькасць крымінальнікаў па артыкулах пра парушэнні выбарчага заканадаўства з хуткім, будзем спадзявацца, усталяваннем у краіне законнасці, дасягне не адной тысячы.

Не варта шкадаваць: гэтыя людзі ведалі, на што ішлі, і быць прыцягнутымі да адказнасці заслужылі.

Справа адбывалася на ўчастку № 73 Мірашнічэнкаўскай акругі 43 Мінска 25 красавіка бягучага года на выбарах у мясцовыя саветы, і пра яе мы ўжо пісалі на сайце нашай газеты 27 красавіка («Чычыкавы ў выбарчых камісіях»). Для большасці, якая не заглядае на сайт, каротка выкладаю сутнасць справы. Падчас галасавання з дзвюма вынаснымі скрынямі на тэрыторыі ўчастку (гэта сельгаспасёлак, прыватная забудова), у адну, кантраляваную назіральнікам, пасля 4,5 гадзін абыходу дамоў, было апушчана 27 бюлетэняў. У іншай, якую суправаджалі толькі сябры камісіі, за 4 гадзіны аказалася 145 бюлетэняў. Што нават перавысіла колькасць заявак на галасаванне ў вынасныя скрыні, якія, паводле 54 артыкула Выбарчага кодэксу, падаюцца загадзя. Заявак было на дзве скрыні 140. Прычым чатыры чалавекі (як высветлілася ў кантраляванай групе), не маглі быць заяўнікамі, бо памерлі ад 2 да 5 год таму.

Выснова: у другую скрыню кідалі бюлетэні і за памерлых, якія непазбежна былі ў другой частцы спісу папярэдніх заявак (101 асоба), і за тых, да каго папросту фізічна не маглі паспець зайсці, і за дадатковыя 44 чалавекі, якія і заяўкі на галасаванне «на вынас» не падавалі, і, зразумела, і не галасавалі ў рэальнасці. Памер «закіду» — мінімум 120 бюлетэняў, а хутчэй — усе 145.

Зразумела, складзены мной і яшчэ адным назіральнікам Антонам Койпішам пратакол пра грубае парушэнне закону не зрабіў уражанне ні на пракуратуру, ні на Цэнтральную выбарчую камісію. Як не быў падпісаны і старшынёй участковай камісіі Мікалаем Чэрнікам, дырэктарам УП «Рэмаўтадор» Савецкага раёна, з супрацоўнікаў якога (і служ-



боўцаў Савецкага «Зеленстроя») камісія і складалася.

Але персанальна для Мікалая Чэрніка і тысяч яму падобных па ўсёй краіне напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2010 года будзе карысны каментар, зроблены да гэтай сітуацыі па нашай просьбе юрыстам і праваабаронцам Алегам Волчакам.

— Махляры з выбарчых камісій хіба спадзяюцца, што яны парушаюць толькі 49 артыкул Выбарчага кодэксу РБ «Адказнасць за парушэнне патрабаванняў Кодэкса», дзе за падлог дакументаў па выбарах і скажэнне вынікаў галасавання прапісана як вельмі агульная «адказнасць паводле заканадаўства РБ». Але дарэмна спадзявацца на лёгкую «агульнасць», бо дзеля абмалявангага і падобных выпадкаў у Крымінальным кодэксе існуюць абсалютна канкрэтныя артыкулы. Такія, як арт. 191 — «Перашкода ў ажыццяўленні выбарчых правоў…», які прапісвае ў частцы 1 пакаранне пазбаўленнем волі да 3 гадоў, а ў частцы 2 (у выпадку дзеянняў групай асобаў і па папярэдняй змове, што і адбываецца ў камісіях) — да 5 гадоў. Але гэта не ўсё. Калі для мясцовых выбараў яшчэ адзін артыкул — 357 («Змова або іншыя дзеянні, здзейсненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады»), прымяняецца з пэўнай нацяжкай, то для прэзідэнцкіх выбараў становішча выглядае інакш. Частка 2 гэтага артыкула абяцае да 15 гадоў турмы за захоп і ўтрыманне ўлады неканстытуцыйным шляхам.

Менавіта частка 2 артыкула 357 і павінна разглядацца сябрамі выбарчых камісій як вельмі праўдападобнае прадказанне іх будучага лёсу. Тым больш што ў выпадку ўзнікнення апісанай у 357 артыкуле сітуацыі, як сцвярджае Алег Волчак, тэрмін даўніны натуральным чынам дзейнічаць не будзе. Для ўсіх «гераічных здзяйсненняў», пачынаючы ад рэферэндуму 1996 года. Ёсць толькі шанец на змякчэнне віны — абсалютна адпаведныя праву дзеянні на выбарах 19 снежня 2010-га.

▸ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# СПРАВЯДЛІВЫЯ ВЫБАРЫ ЗАМЕСТ ЦВК

Генадзь КЕСНЕР

**Актывісты кампаніі «За справядлівыя выбары» падрыхтавалі праекты шасці пастаноў Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, якія, на іх думку, маглі б зрабіць прэзідэнцкія выбары больш празрыстымі і справядлівымі.**



Фота аўтара

Сяргей Калякін і Віктар Карнеенка

Як сцвярджаюць аўтары праектаў пастаноў ЦВК, гэтыя праекты «будуць спрыяць правядзенню празрыстых, свабодных і справядлівых выбараў і прызнанню іх вынікаў сярод удзельнікаў выбарчага працэсу ўнутры краіны і ў міжнароднай супольнасці». На думку каардынатараў кампаніі, прапановы цалкам адпавядаюць выбарчаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь, не патрабуюць яго змянення, акажуць істотную дапамогу сябрам выбарчых камісій, ініцыятыўных груп кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама назіральнікам пры вырашэнні спрэчных пытанняў.

Праекты пастаноў тычацца парадку фармавання выбарчых камісій, правядзення перадвыбарчай агітацыі і сустрэч кандыдатаў на прэзідэнцкую пасаду, выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні прэзідэнцкіх выбараў у 2010 годзе, а таксама правоў назіральнікаў і сябраў выбарчых камісій, падліку галасоў выбаршчыкаў.

Адзін з каардынатараў кампаніі, старшыня Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін адзначыў, што ў распрацоўцы праектаў пастаноў ЦВК актыўны ўдзел бралі беларускія праваабаронцы і юрысты, з якімі кампанія вядзе цеснае супрацоўніцтва.

«Мы і сёння працягваем настойваць на тым, што ініцыятыўная група Аляксандра Лукашэнкі была зарэгістравана незаконна, — заявіў Сяргей Калякін. — Паперашае, мы не згодныя з тым, што ў ЦВК не бачаць ясна прапісаных у законе палажэнняў, згодна якіх чалавек, што збіраецца стаць кандыдатам у прэзідэнты, павінен асабіста прыйсці з пашпартам у Цэнтральную камісію. Па-другое, сутнасць іх адказу зводзіцца да таго, што ў іх менавіта такая заканадаўчая практыка. Тым самым яны ўмешваюцца ў зусім чужую кампетэнцыю, бо ёсць артыкул 33 Выбарчага кодэкса, які ў поўнай меры вызначае правы Цэнтральнай камісіі. Тлумачыць закон ніхто ім права не прадстаўляў. І, па-трэцяе, у адпаведнасці з законам (ч. 3 арт. 49), гэта абскарджванне павінна было быць разгледжана на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі. Але мы ведаем, што пасяджэнне не праводзілася, а чыноўнікі папросту падрыхтавалі нам адказ. Мы патрабуем, каб, у адпаведнасці з законам, наш першапачатковы зварот і гэты былі разгледжаны на пасяджэнні Цэнтрвыбаркаму».

Сяргей Калякін падкрэсліў, што сёння ў Цэнтральнай камісіі існуе абсалютна няроўны падыход да розных прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта.

«Нядаўна Цэнтральная камісія папярэдзіла ініцыятыўную групу Уладзіміра Някляева. У той жа час, мы маем шмат фактаў, калі грамадзяне звяртаюцца і да нас, і ў Цэнтральную выбарчую камісію са скаргамі, што ініцыятыўная група Лукашэнкі груба парушае выбарчае заканадаўства пры зборы подпісаў. Напрыклад, подпісы за яго збіраюць не сябры ініцыятыўнай групы, некаторыя такія выпадкі нават пацвярджаюцца відэаматэрыяламі. Па-другое, мы атрымліваем інфармацыю пра ўдзел адміністрацый у зборы подпісаў, што катэгарычна забаронена законам. У нас ёсць інфармацыя, што ў галоўным будынку Беларускага ўніверсітэта транспарту сярод студэнтаў збірае подпісы асабіста прарэктар па выхаваўчай працы Галіна Чаянава. Такое паведамленне мы атрымалі ад грамадзянкі Шыраковай, якая пражывае ў Гомельскім раёне. Дырэктар сярэдняй школы № 4 горада Івацэвічы збірае подпісы ў працоўны час ва ўстановах гэтага горада, загадчыца дзіцячага садка ў Раўбічах збірае подпісы сярод сваіх супрацоўнікаў, прычым абавязвае іх прынесці пашпарты… Там, дзе выкарыстоўваецца адміністрацыйны рэсурс, амаль паўсюль прысутнічаюць супрацоўнікі сферы адукацыі, і выбаршчыкі справядліва звязваюць гэта з тым, што ініцыятыўную групу Аляксандра Лукашэнкі ўзначальвае міністр адукацыі грамадзянін Радзькоў. І мы ставім пытанне, што гэты адміністрацыйны рэсурс выкарыстоўваецца ў парушэнне Выбарчага кодэкса».

Яшчэ адзін каардынатар кампаніі намеснік старшыні Руху «За свабоду» Віктар Карнеенка паведаміў, што ў склад участковых камісій плануецца вылучыць да 1200 чалавек, а таксама да 1600 назіральнікаў. «Можна, канешне, і больш, але для гэтага трэба багата розных рэсурсаў, якіх, на жаль, няшмат. Але мы лічым, што гэтага дастаткова для таго, каб зрабіць адпаведны аналіз выбарчага працэсу і зрабіць высновы, якія ў нас былі выбары», — адзначыў Віктар Карнеенка.

Па словах Сяргея Калякіна, ужо ў бліжэйшыя выходныя пачнуцца трэнінгі, якія будуць навучаць сябраў участковых камісій, а таксама назіральнікаў.

МІФЫ І ЖЫЦЦЁ

# БЫЛО Б КАМУ ЕСЦІ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Лічыцца, што здатныя на многае беларусы асаблівых поспехаў дасягаюць у вырошчванні бульбы. Як і амаль кожны міф, гэты выкарыстоўваецца ўладай для доказу сваёй еднасці з народам.**



Лепш за ўсіх гэтым міфам карыстаўся А. Лукашэнка. Адзін з сюжэтаў яго бацькоўскага апякунства над бульбаводамі мадыфікаваўся ў трапны студэнцкі анекдот. А ўжо гэтай восенню А. Лукашэнка не толькі персанальна распарадзіўся бульбяным пытаннем (па якой цане прадаваць, дзе і колькі захоўваць, які прыбытак мець), але і загадаў будаваць бульбасховішчы для высокіх ураджаяў, якія краіна будзе атрымліваць на працягу чарговай яго прэзідэнцкай кадэнцыі.

І гэтыя пры тым, што ні тых палеткаў ужо няма, ні беларускай лепшай на свеце бульбы. Пра нізкую яе якасць сведчыць адмова тутэйшага «Макдональдса» ад выкарыстання беларускай бульбы для фры.

Пра невялікую колькасць, падкрэслім, таварнай бульбы кажуць дадзеныя статыстыкі. У мінулым годзе валютная выручка ад бульбянога экспарту Беларусі склала ўсяго 6 мільёнаў долараў. Калі ж ад бульбяной выручкі адмінусаваць вытворчыя ды гандлёвыя выдаткі, вельмі верагодна, што замест прыбыткаў давядзецца падлічваць страты. У мінулым годзе было прададзена 28,2 тысячы тон бульбы, сёлета плануецца прадаць 100 тысяч тон і «зарабіць» 20 мільёнаў долараў. Як кажуць, гара нарадзіла мыш. Экспартная квота ў мінулым годзе склала 0,4% і 1,2% ад статыстычнага памеру ўраджаю.

Але для характарыстыкі эканомікі сучаснага беларускага тыпу ёсць і больш трапная фармулёўка: слон — гэта мыш, зробленая па дзяржзаказу. Мінсельгасхарч хуценька адрэагаваў на «бульбяныя заўвагі» Лукашэнкі і праз намесніка міністра Васіля Паўлоўскага зрабіў адпаведнае ўдакладненне: аказваецца, па стану на 11 кастрычніка за мяжу прададзена ўжо 150 тысяч тон бульбы. Спадар Паўлоўскі аднachасова агучыў і «кантрольныя лічбы», якія, верагодна, будуць зацверджаны на чарговым Усебеларускім сходзе: штогод памер сельгасвытворчасці павінен падвышацца на 15–17%, а за пяцігодку мусіць узрасці ў 1,5 разы.

Што ні слова, то пытанне. Плануецца не толькі павялічваць вытворчасць, але павышаць якасць і прадаваць замест сыравіны перапрацаваную прадукцыю. Але ж глыбокая перапрацоўка звязана з павялічаным выкарыстаннем энергарэсурсаў, кошт якіх хуткімі тэмпамі падвышаецца. Цалкам верагодна, што ўжо пасля беларуска-расійскіх перамоваў пра кошты энерганосьбітаў на наступны год такія планы згубяць эканамічную перспектыву.

Па нейкай прычыне ў гэтых вытворчых разліках ніякім чынам не ўлічваецца дэмаграфічная сітуацыя, ніхто не звяртае ўвагі на змяншэнне колькасці насельніцтва ў краіне. І не толькі ў сельскай мясцовасці, але нават у буйных гарадах. Невялікі натуральны прырост адзначаецца толькі ў Мінску. І тое збольшага за кошт унутраных мігрантаў.

Таму задача — стварыць сацыяльна-эканамічныя ўмовы, каб жыццё на вёсцы і ў горадзе істотна не адрознівалася, і людзі ахвотна пераязджалі з горада ў вёску — выклікае ў памяці карцінку з савецкага мінулага, калі лектар таварыства «Веды» з трыбуны ў сельскім клубе, хаця і ў пакамечаным пінжаку, але пры гальштуку, нешта мармытаў пра *«стирание граней между городом и селом»* слухачам у ватоўках ды гумавых ботах, з пахам сіласу.

Дык вось, дэмаграфічная сітуацыя сведчыць, што колькасць насельніцтва за пяць гадоў зменшыцца на некалькі соцень тысяч чалавек. Многія сельскія раёны перастануць існаваць як вытворчыя комплексы і канчаткова ператворацца ва ўмоўныя адзінкі для адміністрацыйнага ўліку. Працаваць не будзе каму. Ужо ў вёсцы амаль не засталося маладых і здаровых мужчын, якія з апетытам елі сала з бульбай і ад душы працавалі.

Філасофскае пытанне — жыць, альбо паміраць? — ва ўсе часы кожным вырашалася індывідуальна. І ва ўсе часы ў гэта жыццё, у жыццё кожнага беларуса, пастаянна нахабна лезлі ілжэпракрокі-пасярэднікі. То навуковым камунізмам галовы тлумілі, то сацыяльнай рынкавай эканомікай.

**Колькасць насельніцтва за пяць гадоў зменшыцца на некалькі соцень тысяч чалавек. Многія сельскія раёны перастануць існаваць як вытворчыя комплексы**

Бываюць моманты, калі над эканамічнымі інтарэсамі пануе палітычная мэтазгоднасць, якая праяўляецца праз сістэму штучна створаных міфаў. Прыкладам, міфа пра скваплівых бізнесменаў і сацыяльна адказнае кіраўніцтва дзяржавы. Маўляў, мы ім прышчэмім хвост і змусім дзяліцца дывідэндамі па справядлівасці. Гэта на шкоду эфектыўнасці, канкурэнтаздольнасці, вытворчасці? Ды нічога. Пацерпім пакуль што, у цяжкія часы. Але выцягнем на сваіх плячах прадпрыемствы і гаспадаркі, якія ў іншых краінах прынеслі ў ахвяру класаваму эгаізму. І пасля ўжо, калі навакольныя краіны збяднеюць, а цэны ўзрастуць, надыдзе наш час карміць галадаючых. І добра на гэтым зарабіць.

Так бывае, калі ў аснову міфа кладуцца рацыянальныя, хаця і памылковыя разлікі. А ў Беларусі, верагодна, усё прасцей і таму горай. Менавіта той «простотой, что хуже воровства», дзякуючы якой людзі губляюць здольнасць бачыць розніцу паміж рэчаіснасцю і міфалагічным уяўленнем пра яе. У апошні час беларускае кіраўніцтва, так бы мовіць, з асалодай агучвае дадзеныя міжнародных арганізацый пра пашырэнне голаду ў свеце і падлічвае, колькі на гэтым зможа зарабіць. Тое ж з бульбай, цану на якую Лукашэнка забараніў зніжаць і загадаў прытрымаць у сховішчах, пакуль кан'юнктура не зменіцца.

Гэта ўжо па-за межамі прапаганды, гэта натуральны сюр, які не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю. Бо, па-першае, як сведчаць аграрыі, бульбасховішчаў не хапае, па-другое, гаспадаркі не маюць дастаткова таварнай бульбы, па-трэцяе, большую частку той бульбы, якая ёсць (калі яна ёсць), вырошчваюць дачнікі і сельскія пенсіянеры. Яна не псуецца, бо своечасова з'ядаецца.

Нават у савецкія часы, калі сяляне святкавалі дакопкі, то ці добрая бульба парасла, ці дробненькая, хтосьці абавязкова казаў: «Ат, абы было каму яе есці!» Гэта не міф, а метафара, вызначае стаўленне простага чалавека да жыцця. Часцяком беларусам нечага не хапала, як не хапае і зараз. Але ж бульба заўсёды была.

ЭКАЛОГІЯ

# БЕЛАРУСКІ ЎРАН АДПРАВЯЦЬ У РАСІЮ

Вольга ХВОІН

**Беларусь вывезе ў Расію ўран, які захоўваецца на тэрыторыі Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны». Аплачваць праект будуць амерыканцы.**

Ядзернае паліва ў нашай краіне — гэта спадчына савецкіх часоў. Гэта ўран рознай ступені ўзбагачанасці, які выкарыстоўваўся навукоўцамі ў эксперыментальных мэтах: у інстытуце была створана адзіная ў свеце перасоўная АЭС «Памір». У 1986 годзе станцыю знішчылі, а паліва для яе працы засталося. Уран назапашваўся з 1954 па 1987 гады. Паліва «Паміру» на 30 працэнтаў выгарала, але яно яшчэ актыўнае. Уран знаходзіцца ў «басейне» — вялікім баку з вадой, ёсць штат з трох чалавек, якія сочаць за бяспекай. Усяго ў нашай краіне захоўваецца некалькі дзесяткаў кілаграмаў паліва.

Цяпер уран выкарыстоўваецца ў працах на ўстаноўцы «Гіяцынт», на якой разглядаюцца цыклы распаду радыеактыўнага элементаў. «Гіяцынт» — гэта міні-ядзерны рэактар, распрацоўкай якога ў «Соснах» займаліся па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі і пры садзейнічанні МАГАТЭ.

Гэтай вясной Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму ўрану ў вайсковым кантэксце. «Я не буду хаваць: у нас застаўся высокаўзбагачаны ўран — сотні кілаграмаў фактычна ўжо зброевага і менш узбагачанага, — заявіў кіраўнік Беларусі. — Мне некаторыя гавораць: вывозьце гэты ўран. Хочаце ў Амерыку, мы вам заплацім, хочаце ў Расію. Я кажу: па-першае, чаму вы нам дыктуеце, бо гэта наш тавар. Мы яго ўтрымліваем пад кантролем МАГАТЭ».

Тады Лукашэнка запэўніў: «Мы не збіраемся рабіць брудныя бомбы і не збіраемся камусьці прадаваць. Мы ў даследчых мэтах выкарыстаем гэты ўран». Але і выказаў шкадаванне, што з краіны вывезлі ядзерную зброю. «Мяркую, што вывад з Беларусі ядзернай зброі на тых умовах, як гэта было здзейснена нашымі нацыяналістамі, быў жорсткай памылкай. Мне давялося падпісваць гэту дамову, таму што падзецца было няма куды: мяне душылі і Расія, і амерыканцы — выводзіце, бо паабяцалі. Нельга было, гэты найвялікшы набытак,



гэта дарагі тавар, які мы ўрэшце павінны былі прыстойна прадаць», — агучыў сваю пазіцыю беларускі лідэр.

Навуковец Іван Нікітчанка мары Лукашэнкі аб ядзернай зброі аспрэчвае і гаворыць, што ў Беларусі мізэрная колькасць урану, і яе недастаткова для таго, каб прымяняць у вайсковых мэтах. «Уран завозіўся ў савецкія часы. Цяпер яго расход у «Соснах» вымяраецца ў грамах — толькі ў лабараторных метадах выкарыстоўваецца. Таму ніякай небяспекі няма, можаце не хвалявацца», — гаворыць навуковец.

Пытанне пра вываз з краіны ўрану было ўзнятае яшчэ 20 гадоў таму, але толькі цяпер знойдзеныя сродкі для яго транспарціроўкі і захоўвання. Гэта будзе здзейснена ў межах праграмы (яе спансуюць ЗША), паводле якой Расія забірае з краін былога СССР адпрацаванае ядзернае паліва, высокаўзбагачаны ўран.

У Беларусі плануецца пабудаваць новае рэспубліканскае сховішча для захоўвання радыеактыўных адыходаў, тым больш гэта актуальна з планамі ўзвядзення ўласнай АЭС. Навукоўцы ўжо падрыхтавалі рэкамендацыі па яго размяшчэнню. Даследаваная 30-кіламетровая зона паблізу Астравецкай пляцоўкі будучай АЭС і вызначаныя тэрыторыі, на якіх магчыма будаўніцтва новага сховішча. Пакуль названыя 3–4 патэнцыйныя пляцоўкі пад забудову. У новым сховішчы будуць размешчаны як адыходы з АЭС пасля пяцігадовага іх захоўвання на станцыі, так і тыя, што будуць здробненыя і перапрацаваныя на прадпрыемстве «Экарэс».

Радыеактыўныя адыходы будуць змяшчацца ў адмысловыя кантэйнеры і захоўвацца ў сховішчы каля станцыі на працягу 5 гадоў. Высокаактыўныя адыходы плануецца захоўваць у сховішчы на станцыі на працягу ўсяго тэрміна эксплуатацыі АЭС, пасля вываду станцыі з эксплуатацыі гэтыя адыходы мусяць быць перазахаваны. Вывозіць у Расію высокаактыўныя адыходы немагчыма, бо гэта забаронена расійскім заканадаўствам. Што тычыцца адпрацаванага ядзернага паліва, то для Беларусі найбольш аптымальна было б вяртаць яго пастаўшчыку паліва (калі гэта будзе Расія, то, адпаведна, вывозіць у Расію).

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# КАНВЕЕР СМЕРЦІ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Абаронцаў жывёл падзякавалі за «актыўную грамадзянскую пазіцыю». І прапанавалі правесці сумесныя рэйды «па тлумачальнай працы сярод насельніцтва» пра неабходнасць стэрылізацыі хатніх гадаванцаў. Такі адказ атрымала аб'яднанне «Эгіда» на свой зварот у Мінгарвыканкам з просьбай дапамагчы ў адкрыцці прытулку для бяздомных жывёл.**



Бялянава Наталля. Старшыня праўлення ГА «Эгіда», былы намеснік дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Фаўна горада». Замужам, мае сына. Выхаванцы: ірландскі сетэр, дварнягі Ёлка і Мус, каты Марго, Саманта, Марчэла, Мішэль.

Кіраўнік «Эгіды» Наталля Бялянава накіравала ў мінулым месяцы ліст асабіста старшыні гарвыканкама Мікалаю Ладуцьку. А атрымала на яго адказ ад выканаўцы абавязкаў гендырэктара «Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі» Віктара Дзюбанава. Ён прапанаваў таксама паўдзельнічаць у праверках па выкананні правіл утрымання і выгулу хатніх жывёл і выяўленні незарэгістраваных. А напрыканцы выказаў спадзяванне, што такое супрацоўніцтва «дасць станоўчы вынік у галіне абыходжання з жывёламі ў г. Мінску».

«Ніводнага пытання да грамадзяніна Дзюбанава ў нас не было, — адзначыла старшыня грамадскага аб'яднання абароны жывёл «Эгіда» Наталля Бялянава. — І падобна на тое, што ён не зусім разумее, з якой нагоды нам піша».

«Эгіда» і раней звярталася і да кіраўнікоў Мінгарвыканкама, і да прэзідэнта. Праблему «адфутбольваюць» іншым ведамствам, і дагэтуль яна не зрушылася з мёртвай кропкі. «Для адкрыцця прытулку не патрэбна вялікіх фінансавых укладанняў, — падкрэсліла Наталля Бялянава. — «Эгіда» і валанцёры гатовы па-ранейшаму даглядаць жывёл, забяспечваць харчаваннем, лячэннем і шукаць ім гаспадароў. Ад гарадскіх уладаў мы просім пасадзейнічаць толькі ў адным — выдзеліць будынак. Гэта быў бы першы афіцыйны прытулак для бяздомных жывёл».

Для ўтрымання жывёл зоаабаронцы арэндуюць дамы, у тым ліку за горадам. Штодзённыя паездкі валанцёраў цягнуць за сабой затраты часу і выдаткі на дарогу. Яшчэ год таму аб'яднанне «Эгіда» прасіла пад уладкаванне прытулку адзін з пустуючых дамоў у Мінску. І звярнулася да яго ўладальніка — «Мінсккаапдругрэсурсы», але адказу так і не атрымала. Затое, не клапоцячыся пра дазволы, будынак аблюбавалі бамжы.

У «Эгідзе» таксама лічаць, што ў Мінску магчыма адкрыць і яшчэ адзін прытулак. Яго можна ўтрымліваць за кошт тых сродкаў, якія людзі адлічаюць за валоданне сабакамі. І на гэтыя сродкі ў Мінску пачалі будаваць гасцініцу для жывёл, у якіх ёсць гаспадары. «Безумоўна, гасцініца для хатніх жывёл — гэта добрая справа. Але яе павінна пабудаваць дзяржава. Гэта ж стане камерцыйным праектам, бо за часовае ўтрыманне жывёл гараджане будуць плаціць. А за нашы грошы, якія гадамі складаліся ад збору за валоданне сабакамі, мы хочам, каб пабудавалі прытулак, а не камерцыйнае прадпрыемства для дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», — заявіла Наталля Бялянава. Яна паведаміла, што за прапанову зрабіць замест гасцініцы прытулак ужо распачаўся збор подпісаў.

Раней валанцёры дапамагалі даглядаць і за адлоўленымі жывёламі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Фаўна горада». За свае грошы яны лячылі жывёл у ветэрынараў, рабілі прышчэпкі, стэрылізавалі, шукалі ім гаспадароў. Але з прыходам новага дырэктара, Аляксандра Тамашэўскага, валанцёраў адхілілі ад гэтага занятку. Яны распавялі, што зараз «Фаўна», якая часта ў СМІ выдаецца за «прытулак», ператварылася ў канвеер смерці. Жывёлам не аказваецца элементарная медыцынская дапамога, не кажучы пра прышчэпкі ці пазбаўленне ад глістоў і паразітаў. Уся праца ветэрынараў зводзіцца выключна да ўсыплення жывёл. Іх уладкаванне, па меркаванні валанцёраў, не ставіцца за мэту. Дарэчы, гасцініца для хатніх жывёл будзе ўзводзіцца насупраць «Фаўны горада».



Толькі за апошнія паўтары гады валанцёры (іх зараз 80) і «Эгіда» выкупілі ў «Фаўны горада» больш 500 сабак. Гэта дадзеныя на пачатак лета. А ўсяго за гэты перыяд у іх атрымалі прытулак 1218 жывёл, і для 841 з іх знайшлі гаспадароў. «Усе жывёлы, якія выкупляюцца з «Фаўны горада», хворыя. Спачатку іх трэба вылечыць, некаторыя паміраюць, нічога зрабіць немагчыма. Пасля мы іх прышчэпліваем. І толькі потым стэрылізуем. На «Фаўне» забаранілі лячыць і прышчэпліваць. Адлоўленыя здаровыя жывёлы там падхопліваюць вірус, захворваюць, і іх усыпляюць па «інфекцыйнаму захворванню». Выжыць там немагчыма, калі не пагалоўна прышчэпліваць і лячыць захварэлых. Маецца ліцэнзія і на аказанне ветэрынарных паслуг. Але асноўная «паслуга» — гэта ўсыпленне», — кажа Наталля Бялянава.

Улады Масквы забаранілі адлоў сабак і катоў з мэтай іх знішчэння. Уведзены меры па масавай стэрылізацыі жывёл. Падобныя захады зроблены і ў іншых гарадах Расіі. «Гуманныя адносіны да жывёл з боку чыноўнікаў і дзяржавы толькі ўздымуць іх рэпутацыю ў вачах свайго народа і іншых краін. Але пакуль у нас забойства адлоўленых жывёл застаецца адзіным рашэннем праблемы», — адзначыла кіраўнік «Эгіды».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# «ТВОРЧЫ КІРМАШ» САБРАЎ ГРАМАДУ Ў ІВЯНЦЫ

Генадзь КЕСНЕР

**Цудоўныя майстры — кавалі, разьбяры, мастакі, выбітныя самадзейныя артысты і знакамітыя выканаўцы, шэдэўры народнай творчасці і ветлівае сонечнае надвор'е сталі атрыбутамі першага «Творчага кірмашу», які 16 кастрычніка адбыўся ў гарадскім пасёлку Івянец Валожынскага раёна Мінскай вобласці. На ім пабывалі больш за дзве тысячы гасцей. І гэта не ўлічваючы непасрэдных удзельнікаў сапраўды народнага свята.**

Арганізавалі «Творчы кірмаш» Івянецкі музей традыцыйнай культуры (менавіта каля яго размясцілася сцэна, з якой потым выступалі мясцовыя і заезджыя творцы), а таксама Івянецкі пасялковы Савет і цукеркавае прадпрыемства «Івкон».

Хоць урачыстае адкрыццё «Творчага кірмашу» мусіла пачацца апоўдні, яшчэ задоўга да гэтага каля адмысловай пляцоўкі цудадзеі народнага майстэрства ўжо выставілі свае стэнды, на якіх можна было ўбачыць шмат прыгожых рукатворных вырабаў.



Правядзенню свята паспрыялі і мясцовыя ўлады — непасрэдна побач з самім кірмашом размясціліся намёты са століками, дзе можна было пакаштаваць найсмачнейшыя шашлыкі, смажаны ды шмат што іншае, а таксама зрабіць на зіму садавінна-гароднінныя прыпасы.

На самым пачатку адбылася цырымонія асвячэння адрэстаўраванай капліцы Божай Міласэрнасці ў былой сядзібе Пятра Драгунцава. «Так склалася ў нас цяпер, што вобраз Езуса Міласэрнага вандруе па хатах і напаўняе нашы сэрцы духам міласэрнасці, — сказаў падчас асвячэння ксёндз Лех Боханэк. — Гэта капліца была пабудаваная ў той час, калі Івянцом валодаў род Плявакаў. Таму вітаем тут прадстаўніка роду Плявакаў — его беларускай галіны Аляксандра Пляваку, які таксама прыбыў на гэту ўрачыстасць. Вітаю гасцей з Варшавы, вітаю ўсіх, хто дапамагаў у аднаўленні гэтай капліцы, усіх жыхароў вуліцы Прамысловай, якія збіралі сродкі на скульптуру і актыўна дапамагалі, і ўсіх, хто спрычыніўся да гэтай справы». Пасля непрацяглага набажэнства людзі рушылі да кірмашу.

«Тут, на гэтай сядзібе, сёння ўсе творац. О, якое таемства! Прыйшлі з далёкіх княстваў розныя-розныя пілігрымы абудзіць у нас тое, чаго хаваем, з чым не згаджаемся, пра што маўчым. Дык хадзеце, будзем тварыць!» — заклікала гасцей і ўдзельнікаў свята вядоўца і адна з арганізатараў «Творчага кірмашу» паэтка, этнограф і культуролаг Антаніна Хатэнка.

Сам кірмаш складаўся з асобных тэматычных міні-кірмашыкаў. Прычым кожны з гасцей мог не толькі набыць ужо гатовыя творы мастацтва альбо кустарную прадукцыю народных майстроў, але і сам паспрабаваць сябе ў ролі разьбяра, ткача, каваля ці кухара, намаляваць карціну ды ўвогуле знайсці сабе справу па душы.

Тут жа мясцовыя «самародкі» ўжо даволі прафесійна займаліся ткацтвам, маляваннем, разьбой па дрэву. Уладзіславу Ярашэвічу толькі споўніўся 21 год, але ён ужо дасведчаны каваль, які займаецца гэтай не зусім тыповай для сучаснай моладзі справай адносна працяглы час.

«Мяне прыцягвае метал, ён мяне нібы падштурхоўвае, каб я працаваў з ім, — кажа маладзён. — У нагрэтым стане метал — нібы пластылін, яго можна ляпіць, а я вельмі люблю скульптуры… У мяне хтосьці з продкаў быў кавалём, відаць, таму мяне цягне да гэтай справы. Упершыню я паспрабаваў кавальства больш за год таму на адным са святаў, мне вельмі спадабалася, і цяпер я стала гэтым займаюся. Я спадзяюся, што гэта будзе не толькі маё хобі, але я збіраюся зарабляць гэтым грошы і нават навучаць іншых працаваць з металам. А ўвогуле, кавальства — гэта ж старажытная традыцыя для беларусаў. Тут восьі ўхваты для чыгункоў, качыржкі, тыя ж падковы, так што кавалі — самыя сапраўдныя беларусы!»

На «Творчым кірмашы» можна было і прадэгуставаць цукеркі вытворчасці аднаго з арганізатараў — прадпрыемства «Івкон». І пашукаць сабе жонку на адмысловым жартаўлівым вясельным кірмашыку. У каго бракавала грошай, той, каб не застацца галодным і не страціць прытомнасць ад невырагодных шашлыковых пахаў, мог бясплатна пачаставацца рысавай кашай з ваенна-палявой кухні.

А вось фальклорны калектыў «Дубінскія фанабэры» прывёз на кірмаш не толькі сваю творчасць, але і багата чаго іншага: і сала хатняе, і салаткі самаробныя, і разнасолы разнастайныя, і нават «жывую вадзіцу», ужыўшы якую, цяжка было выдахнуць, бо была гэтая вадзіца моцнасцю градусаў так пяцьдзесят, калі не болей.

Усе ахвотныя за сімвалічны кошт у 500 беларускіх рублёў маглі пракаціцца на павозцы праз увесь Івянец, дзе, дарэчы, ёсць што паглядзець, ці асядлаць кабылку ці коніка. А потым былі выступы народных калектываў, асаблівую цікавасць выклікала імпрэза з удзелам чальцоў рыцарскіх клубаў, што ў гэтым месцы і ў гэты час было вельмі і вельмі дарэчы. Парадавалі сваімі выступамі і гурты, у тым ліку «Джамбібум», і, натуральна, хэдлайнер, калі толькі гэтае слова дарэчы на івянецкага кірмашы, спявак і кампазітар Зміцер Вайцюшкевіч.

Арганізатары і госці выказалі спадзяванне, што «Творчы кірмаш» у Івянцы стане добрай традыцыяй. Чаго яму і жадаем.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 25 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.35** «Культурныя людзі».
**11.05** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Камедыя «Ведаць бы, што я геній».
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.30** Nota Bene.
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.40** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.50, 01.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.10** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША).
**23.30** Драма «Здраднік» (ЗША).
**01.35** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** Прэм'ера. «Галасы».
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Ведзьмакі».
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Я-вандроўца».
**13.00** «Ля параднага пад'езду».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Прэм'ера! Фільм «Фобас». Расія.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Алекс і Эма». ЗША, 2003г.

### лад

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака».
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.10** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**12.30** Пра мастацтва.
**12.55** Школа рамонту.
**14.00** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Тэлебарометр.
**15.30** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Музычная камедыя «Сем старых і адна дзяўчына» (СССР).
**20.45** «Калыханка».
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.10** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Авертайм.
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**00.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Вялікае-вялікае дзіця. Юры Багатыроў». Дакументальны фільм.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** Тэлесерыял «Дворык».
**13.25** «Гарадок».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне». 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** «Таблетка ад старасці. Міфы і рэальнасць». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Моладзевы серыял «Барвіха».
**15.10** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.35** Прэм'ера. Баявік «Брацэнікі».
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.50** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Слалам-гігант. Жанчыны (Аўстрыя). Спроба 2.
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Слалам-гігант. Мужчыны (Аўстрыя). Спроба 2.
**11.45** Тэніс. Турнір WTA (Японія). Фінал.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA (Кітай). Фінал.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Слалам-гігант. Жанчыны (Аўстрыя). Спроба 2.
**15.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Слалам-гігант. Мужчыны (Аўстрыя). Спроба 2.
**16.15** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Лос-Анджэлес (ЗША). Фінал.
**17.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Мадрыд (Іспанія). Фінал.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Сербія.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Слалам-гігант. Жанчыны. Зольдэн (Аўстрыя). Спроба 2.
**01.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Слалам-гігант. Мужчыны. Зольдэн (Аўстрыя). Спроба 2.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма): «Гарадзельская унія».
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** ПраСвет.
**08.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Шампані».
**08.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.20** Басанож па свеце: «Манголія, 1958».
**09.45** Дакументальная гадзіна: «Генацыд армянаў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**10.40** «Малая Масква», тэлесерыял.
**11.25** Фільматэка майстроў: «Падарожжа ў прэрыі», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.20** Госць «Белсату».
**18.35** Невядомая Беларусь: «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Ноч з генераламі», дак. фільм, 2001 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Выбары-2010. Прэтэндэнты.
**21.35** Прыватная калекцыя.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Падарожжа ў прэрыі», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**23.40** Аб'ектыў.

## 26 КАСТРЫЧНІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.10, 18.00, 19.00, 23.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** «Актуальнае інтэрв'ю».
**12.10** Іранічная камедыя «Квартэт для дваіх» (Расія).
**14.05** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Аўташкола.
**16.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.50, 01.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША).
**23.15** Трылер «Кантракт» (ЗША - Германія).
**01.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**22.15** Прэм'ера. «Мікіта Міхалкоў. Самі з вусамі».
**23.20** Нашы навіны.
**23.50** Навіны спорту.
**23.55** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.30** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Кажа і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Фобас». Расія, 2010г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Меч». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.50** Прэм'ера! «Таямніца «Святога Патрыка». Серыял.

### лад

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Музычная камедыя «Сем старых і адна дзяўчына» (СССР).
**12.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**13.10** Авертайм.
**13.40** «Запал па культуры».
**14.20** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».
**20.50** Калыханка.
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** «Спорт-кадр».
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** Прэм'ера. «Чалавек з нясправаджанага. Аляксандр Грын». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** Тэлесерыял «Дворык».
**12.20** Тэлесерыял «Было каханне». 2010 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне». 2010 г.
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Згуба «Паветранага Тытаніка». Стратанаўты». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Моладзевы серыял «Барвіха».
**15.10** «Жывуць жа людзі!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Прэм'ера. Баявік «Брацэнікі».
**23.55** «Вочная стаўка».
**00.50** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** «Спартовы вандроўца». Часопіс.
**09.50** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.30** Тэніс. Турнір WTA (Аўстрыя). Фінал.
**12.45** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). Фінал.
**14.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**14.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**15.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA 2009. Доха (Катар). Фінал.
**16.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**22.45** Тэніс. «За кулісамі». Часопіс.
**23.00** Бокс. ЗША.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**00.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Агляд сезону.
**00.40** Матаспартыўны часопіс.
**00.45** Ралі. Ралі-рэйд. «Ралі Фараонаў». Егіпет. Агляд.
**01.10** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**01.15** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Прыватная калекцыя.
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Ноч з генераламі», дак. фільм, 2001 г., Польшча.
**09.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.30** Невядомая Беларусь: «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.00** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**10.30** «Дзеці і рыбы», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 8 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма): «Гарадзельская унія».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Вагон.
**20.40** Хто ёсць кім?: журналістка Ірына Халіп – мужнае сэрца.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Выбары-2010. Прэтэндэнты.
**21.35** Асабісты капітал.
**21.55** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 8 серыя: «Мы за вамі назіраем», 2007 г., Егіпет.
**22.50** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**23.15** «Доктар Марцін», серыял: ч. 2, 2 серыя.
**00.00** Аб'ектыў.

## 29 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.50, 18.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Дэтэктыў «Старыя палкоўнікі» (Украіна).
**13.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Бочкі-маці».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Першы канал прадстаўляе: гала-канцэрт «Беларусь адкрытая свету».
**00.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**01.15** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**02.00** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Восеньская серыя гульняў.
**22.35** «Дэтэктар хлусні».
**23.40** «Наша Белараша».
**00.10** Закрыты паказ.
**03.10** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Укол парасонікам». Францыя.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Спартанец». Германія - ЗША, 2004 г.
**01.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія). Заключная серыя.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Камедыя «Ты - мне, я - табе» (СССР).
**12.20** Час футболу.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** Гаспадар.
**13.35** Жывы гук.
**14.15** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.20** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Віцязь (Чэхаў). Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** «Пра мастацтва».
**23.50** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі» (Аўстралія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.05** Тэлесерыял «Было каханне». 2010 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Прэм'ера. Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне». 2010 г.
**22.20** Прэм'ера. «Дзяўчаты».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Фільм «Выспа». Расія.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.10** «Бітва за Поўнач».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Моладзевы серыял «Барвіха».
**15.05** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Рускі Галівуд: Дыяментавая рука-2».
**23.00** «Нтвшнікі».
**00.10** Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Чысцільшчык».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**11.25** «Спартовае вандраванне». Часопіс.
**11.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету. Глазга (Шатландыя/Вялікабрытанія). Фінал.
**12.30** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Мадрыд (Іспанія). Фінал.
**14.00** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**16.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**22.45** Тэніс. «За кулісамі». Часопіс.
**23.00** Покер. Каны (Францыя).
**00.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-Пры суперсерый. Нарвегія.
**01.00** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**01.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Без рэтушы: «Песні колераў восені», рэпартаж, 2008 г. , Польшча.
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Невядомы і блізкі. Каталіцкі касцёл у Беларусі», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**09.20** Беларусы ў Польшчы.
**09.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**09.40** Басанож па свеце: «Манголія, 1958».
**10.05** «Зорны пірат», тэлесерыял.
**10.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 4 серыя.
**11.15** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 12 серыя.
**12.00** «Год каметы», прыгодніцкая камедыя, 1992 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 4 серыя.
**18.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Ноч з генераламі», дак. фільм, 2001 г., Польшча.
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Магдэбургскае права ў Беларусі».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 8 серыя: «Мы за вамі назіраем», 2007 г., Егіпет.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** «Браты-ворагі», дак. серыял, 2010 г., Францыя: 1 серыя: «Прафсвязаўскі дзеяч і інтэрнэт-бізнесовец».
**22.10** «Чалавек з мармуру», маст. фільм, 1976 г., Польшча.
**00.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Карусель».
**00.50** Аб'ектыў.

## 30 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

### 1

**06.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.15** Існасць.
**07.40** Дзень спорту.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.20** «Аўташкола».
**11.05** Дакументальны цыкл «Невядомая версія» (Украіна).
**12.10** Камедыя «Дзяўчаты» (СССР).
**14.10** Відэафільм АТН «Кропка адліку. У Германію за досведам».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.45** Nota Bene.
**17.10** Дакументальны серыял «Гараджане»: Мурска Собата» (Славенія).
**17.40** Відэафільм АТН «Баранавіцкія прысвячэнні» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.50** Прэм'ера. Меладрама «Элегія» (ЗША).
**00.00** «Эпоха».
**00.55** Дзень спорту.

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** Фільм «Каліна чырвоная».
**14.00** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Двух лёсаў лінія адна».
**17.20** «Тур дэ Франс».
**18.15** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.15** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка-5».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** «Міс Свету 2010».
**00.30** «Пражэктарпэрысхілтан».
**01.05** Фільм «Апошні кадр».

### СТВ

**06.30** «Анфас».
**06.45** Фільм «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі». СССР, 1987г. Закл. серыя.
**07.50** Фільм «Укол парасонікам». Францыя, 1980г.
**09.35** Прэм'ера! «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**14.25** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Тарпеда» (Жодзіна) - «БАТЭ» (Барысаў). Прамая трансляцыя.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Вяртанне блуднага таты». Расія, 2006г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Шосты дзень». ЗША, 2000г.
**23.50** Фільм «Дабранач і поспехаў». ЗША - Францыя - Японія - Вялікабрытанія, 2005г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.30** Усё аб бяспецы.
**07.55** «Рэальны свет».
**08.30** Дыялогі аб рыбалцы.
**08.55** Жансавет.
**09.35** Драма «Восеньскія кветкі» (Украіна). 1-я - 4-я, заключная, серыі.
**13.30** Тэлебарометр.
**13.35** «Запал па культуры».
**14.15** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.25** Фантастычны баявік «Двайняты» (Ганконг-ЗША).
**17.30** Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Юнайтэд - Тотэнхем. Прамая трансляцыя.
**21.30** Тэлебарометр.
**21.35** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**23.55** Жывы гук.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт».
**07.30** Фільм «Душачка».
**08.50** Фільм «Апошні жулік».
**10.15** Мультфільмы.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Выспа». Расія.
**14.00** Весткі.
**14.15** «Здабытак рэспублікі».
**14.30** «Нататкі натураліста».
**15.05** «Пакой смеху».
**16.10** Фільм «Чужыя лісты».
**18.05** «Суботні вечар».
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Фільм «Кветкі ад Лізы». Расія, 2010 г.
**00.15** Фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Прыгодніцкая фантастыка «Адысей і выспа смугі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Прэм'ера. «Музычны рынг НТБ».
**00.55** Прэм'ера. Крымінальная драма «Параноід Парк».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Кваліфікацыя. Акаяма (Японія).
**10.15** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**10.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**11.00** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Лос-Анджэлес (ЗША). Фінал.
**12.30** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**14.00** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Мадрыд (Іспанія). Фінал.
**15.30** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Групавы этап. Доха (Катар).
**17.15** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Доха (Катар). 1/2 фіналу.
**21.15** Тэніс. «За кулісамі». Часопіс.
**21.30** Байцоўскі клуб. Klash. Германія.
**00.30** Настольны тэніс. Кубак свету. Магдэбург (Германія). 1/4 фіналу.
**02.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Кваліфікацыя. Акаяма (Японія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** «Браты-ворагі», дак. серыял, 2010 г., Францыя: 1 серыя: «Прафсвязаўскі дзеяч і інтэрнэт-бізнесовец».
**08.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Магдэбургскае права ў Беларусі».
**08.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Ноч з генераламі», дак. фільм, 2001 г., Польшча.
**09.30** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 1 серыя.
**09.55** Калыханка для самых маленькіх.
**10.30** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 8 серыя: «Мы за вамі назіраем», 2007 г., Егіпет.
**11.25** «Чалавек з мармуру», маст. фільм, 1976 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял: 8 серыя.
**18.00** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Сямейныя каштоўнасці», маст. фільм, 1965 г., ЗША.
**22.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Прафесія».
**23.00** Аб'ектыў.

## 31 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**07.50** Дзень спорту.
**08.00** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія). Заключны фільм.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**12.10** «Зрабі свой выбар».
**14.00** «Кінашок» па-беларуску.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.00** Прэм'ера. Сямейны прыгодніцкі фільм «Таямніца Мунакра» (Францыя-Вялікабрытанія - Венгрыя).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.00** Баявік «Містэр і місіс Сміт» (ЗША).

**ОНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** Фільм «Прыгажосць зямная». Францыя, 2006.
**14.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**23.25** «Што? Дзе? Калі?».
**00.30** Прэм'ера. Фільм «Выканаўчы ліст».

**СТВ**

**06.55** Фільм «Шосты дзень». ЗША, 2000 г.
**09.00** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Мы з джазу». СССР, 1983 г.
**15.30** «Дарагая перадача».
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Паўсвятло». Германія - Вялікабрытанія, 2006 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.45** Фільм «Банзай, рэжысёр!». Японія, 2007 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

**07.05** Дабравест.
**07.30** Мір вашай хаце.
**07.45** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Школа рамонту.
**11.50** Тэлебарометр.
**11.55** Бухта капітанаў.
**12.35** Кінаспробы.
**12.55** «Правы чалавека».
**13.10** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**14.55** Гандбол. Адборачны матч чэмпіяната Еўропы 2012. Беларусь - Расія. Прамая трансляцыя.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Дынама (Рыга). Прамая трансляцыя.
**19.15** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**20.15** Смешная часіна.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.15** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (ЗША-Вялікабрытанія).
**23.40** Культасвет.

**РОССИЯ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.30** Фільм «Кветкі ад Лізы». Расія, 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Мой сябар - чалавек несур'ёзны».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** Фільм «Калі дрэвы былі вялікімі».
**16.35** Фільм «Мяне гэта не тычыцца».
**18.25** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Фільм «Калі квітнее бэз». 2010 г.
**22.55** Фільм «Арэлі». 2007 г.
**00.40** «Адмысловы карэспандэнт».

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Бітва за Поўнач».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Праспявана ў СССР».
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. «Марскія д'яблы. Лёсы».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.30** «Футбольная ноч».
**01.00** «Нерэальная палітыка».

**EUROSPORT**

**06.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Размінка. Акаяма (Японія).
**07.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Акаяма (Японія).
**08.15** Ралі. Ралійная серыя IRC. Абердзін (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 2.
**08.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Акаяма (Японія).
**09.40, 10.55, 19.10** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**09.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Доха (Катар). 1/2 фіналу.
**11.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Акаяма (Японія).
**12.00** Настольны тэніс. Кубак свету. Магдэбург (Германія). 1/2 фіналу.
**13.30** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Доха (Катар). 1/2 фіналу.
**14.45** Вось дык так!!!
**15.00** Настольны тэніс. Кубак свету. Магдэбург (Германія). Фінал.
**17.00** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Доха (Катар). Фінал.
**19.00** Тэніс. «За кулісамі». Часопіс.
**19.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Акаяма (Японія).
**20.15** Матаспартыўны часопіс.
**20.30** Бокс. ЗША.
**21.30** Бокс. Турнір Bigger's Better (Кіпр).
**23.30** Вось дык так!!!
**23.45** Тэніс. Выніковы турнір WTA. Доха (Катар). Фінал.
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Акаяма (Японія).
**02.15** Матаспартыўны часопіс.

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**08.15** Вагон.
**08.25** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**08.50** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**09.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.55** Калыханка для самых маленькіх.
**10.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**11.15** «Сямейныя каштоўнасці», маст. фільм, 1965 г., ЗША.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.40** «Час гонару», тэлесерыял: 1 серыя.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Эпоха Барадуліна», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Бітва з татарамі пад Клецкам».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Перу, Амазонія».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Флоцкі смак».
**21.55** Фільматэка майстроў: «Тым, хто кахае», маст. фільм, 1998 г., Іспанія–Францыя.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Алкаголь».
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---



## Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐ № ______ (вход, по карте отправки)

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у аддзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ГАТОВЫЯ ДА АРКТЫЧНАЙ ВАЙНЫ?

Алег НОВІКАЎ

**У Грэнландыі знойдзеныя каласальныя радовішчы нафты. Пачатак іх эксплуатацыі, запланаваны праз пару гадоў, можа цалкам змяніць геапалітычную сітуацыю ў рэгіёне.**




Грэнландыя, як вядома, самы вялікі востраў у свеце. Аднак пры гэтым тут жывуць усяго 56 тысяч чалавек. Мясцовы бюджэт галоўным чынам фармуецца за кошт экспарту рыбы і датацый з Даніі, у склад якой Грэнландыя ўваходзіць на правах шырокай аўтаноміі.

Аднак цяпер лядовы востраў стаіць на парозе рэвалюцыі. «Cairn Energy» — брытанская кампанія, якая займаецца пошукам карысных выкапняў, — абвясціла, што ў бліжэйшай перспектыве Грэнландыя можа скласці канкурэнцыю такім буйным вытворцам чорнага золата, як Венесуэла, Лівія, Азербайджан і нават краіны Персідскага заліву.

Сэр Біл Гэмэл, цяперашні дырэктар «Cairn Energy» кажа, што Грэнландыя — адна з самых перспектыўных тэрыторый для здабычы нафты. Агульны памер яе нафтавага басейна як мінімум 72 тысячы квадратных кіламетраў.

Ужо зараз розныя фірмы спрачаюцца за права доступу да рэсурсаў. У наступным годзе пачнецца пробнае свідраванне на поўдні краю. Фінансаваць праект будуць брытанцы і індусы. Бюджэт праекту — больш за 8 мільярдаў долараў. Плануецца стварыць на працягу трох гадоў дзесяць пляцовак. Акрамя «Cairn Energy» вока на Грэнландыю паклалі такія монстры нафтавай вытворчасці, як «ExxonMobil» і «Chevron». Яны вядуць свае геалагічныя даследаванні і збіраюцца паставіць на востраве нафтавыя вышкі прыблізна ў 2014 годзе. Увогуле, у мясцовае ўрадавае бюро, якое займаецца выдачай канфесій на права здабычы карысных выкапняў, ужо паступіла 17 заяў ад 12 карпарацый.

Цікава, што ад удзелу ў бітве за смачныя кавалкі грэнландскай нафты адмовілася кампанія «British Petroleum» (BP). Аднак тут, на думку спецыялістаў, была важная прычына.

Пасля катастрофы ў Мексіканскім заліве на платформе BP удзел канцэрну ў грэнландскіх праектах выглядаў бы вельмі супярэчлівым. Менеджэры кампаніі кажуць, што хацелі б вытрымаць нейкі час, каб супакоіць грамадскую думку, а пасля таксама заняцца асваеннем палярных рэсурсаў планеты.

У прынцыпе, шок ад аварыі ў Мексіканскім заліве ва ўрадавых і ў бізнес-колах сапраўды вельмі моцны. Міністэрствы, будаўнічыя фірмы і кампаніі, адказныя за эксплуатацыю нафтавых платформаў, апошнім часам уносяць карэктывы ў правілы бяспекі. Не кажучы пра тое, што Вашынгтон цалкам забараніў здабычу нафты з амерыканскіх шэльфаў. Гэта, дарэчы, сарвала план эксплуатацыі вялікіх радовішчаў ля берагоў Аляскі, што планавала пачаць кампанія «Royal Dutch Shell». Свайго апошняга слова не сказала Еўропа, дзе еўрапейская камісія дамагаецца аналагічнага амерыканскаму мараторыя на марскую здабычу нафты да таго часу, пакуль не будуць яснымі прычыны аварыі на платформе BP. Скараціла аб'ёмы здабычы Нарвегія, асцерагаючыся паўтору карыбскай катастрофы.

Аднак для тых, хто збіраецца прыйсці ў Грэнландыю, гэта толькі на руку. Забарона на свідраванне ў ЗША выклікала рост попыту на нафту, што абяцае кампаніям значныя прыбыткі. Нават калі Вярхоўны суд ЗША адменіць сваё рашэнне — урад Аляскі зараз патрабуе адмены мараторыя са спасылкай на кепскі стан эканомікі ў штаце — сусветны кошт у бліжэйшы час не будзе падаць ніжэй за 75 долараў за барэль. Гэта робіць грэнландскія праекты цалкам рэнтабельнымі.

Адначасова ўсе энергетычныя кампаніі клянуцца, што зрабілі высновы з трагедыі ў Мексіканскім заліве і прынялі больш суровыя экалагічныя стандарты эксплуатацыі. Тым больш, што грэнландскі ўрад таксама вымагае ад патэнцыйных інвестараў прытрымлівацца жорсткіх крытэраў тэхнікі бяспекі на нафтавых вышках. «Нашы інспектары кантралююць усе, што звязана з бяспекай працэдуры здабычы», — кажа прадстаўнік адміністрацыі. Да маніторынгу за здабычай нафты ў палярных водах падключыцца Канада, якая мае агульныя марскія межы з Грэнландыяй.

Хаця эколагі ўсё роўна супраць. На іх думку, адкрыцці «Cairn Energy» могуць выклікаць хуткую індустрыялізацыю рэгіёну. Да слова, у 2012 і 2013 гадах плануюць выдаць ліцэнзіі таксама на эксплуатацыю газавых рэсурсаў краю. Вядомая экалагічная арганізацыя «Greenpeace» ужо агучыла спецыяльную крытычную заяву наконт напалеонаўскіх планаў энергетычных кампаній. «Зялёныя» катэгарычна супраць праектаў асваення Грэнландыі. З'яўленне на рынку палярнай нафты відавочна затармозіць развіццё сегменту альтэрнатыўнай энергетыкі.

Паралельна таму, як карпарацыі збіраюцца пачаць распрацоўку радовішчаў, «Greenpeace» рыхтуецца да правядзення кампаніі «Вяртайцеся дахаты!». Адрасатам тут, відавочна, выступаюць «Shell», «Statoil», «Cairn Energy» і іншыя фірмы. Эколагі будуць намагацца сарваць спробы будаўніцтва марскіх нафтавых платформаў. У сваю чаргу, урад Даніі, рыхтуючыся да інцыдэнтаў з эколагамі, накіраваў у воды Грэнландыі фрэгат «Vaedderen».

Акрамя росту попыту на нафту ёсць яшчэ адзін фактар для таго, каб запусціць праект як мага хутчэй, — амбіцыі Грэнландыі стаць цалкам самастойнай дзяржавай. Калі грэнландская нафта выйдзе на рынак, край зможа зменшыць фінансавую залежнасць ад Даніі. Па разліках мясцовых прыхільнікаў незалежнасці, датацыі можна будзе скараціць як мінімум удвая (зараз яны складаюць каля 1,5 мільярдаў долараў штогод).

Прыбыткаў ад нафты таксама павінна хапіць на стварэнне стабільнага сектару эканомікі, незалежнага ад Даніі. Праўда, не ўсе незалежнікі трымаюцца такой пазіцыі. Тон у руху за незалежнасць Грэнландыі задае левая партыя Inuit Ataqatigiit, якія ахвотна эксплуатуе тэму ўнікальнасці мясцовай прыроды.

Нарэшце, пачатак здабычы нафты ў Грэнландыі відавочна стане пралогам пачатку вайны вялікіх дзяржаў за карысныя выкапні Арктыкі. Як кажуць эксперты «Shell», праз 20 гадоў чвэрць усёй нафты на планеце будзе здабывацца за палярным кругам. Апошнім часам Нарвегія, Расія, ЗША і Канада вядуць паміж сабой інфармацыйную вайну на тэму падзелу шэльфу Арктычнага акіяну. Асобна тут трэба ўзгадаць пацяпленне клімату, што радыкальна спрашчае доступ чалавека і тэхнікі ва ўчарашнюю вечную мерзлату.

Пакуль, аднак, дзяржавы-канкурэнты кажуць пра тое, што ўсе праблемы могуць быць вырашаныя праз кампрамісы. Але сапраўдная вайна за арктычную нафту яшчэ толькі стартуе.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Мірны вынік пятнічнага пасяджэння Мытнага саюзу можна тлумачыць як сігнал расійскіх уладаў, што ў адсутнасць Аляксандра Лукашэнкі Расія і Беларусь цалкам здольныя дамовіцца. Паколькі ўсе дамоўленасці дасягнутыя на ўзроўні прэм'ер-міністраў.

**«Ведомости» (Расія)**

Рэальнай альтэрнатывы А. Лукашэнку ў Беларусі на сённяшні дзень няма. А без моцнага канкурэнта нават уплыў Расіі ў беларускіх узброеных сілах губляе сваю значнасць. Адсюль высноўа — А. Лукашэнка застанецца прэзідэнтам краіны, і Масква пры ўсім жаданні не зможа перашкодзіць яму гэта зрабіць. Таму яна толькі паспрабуе максімальна ўскладніць яго прэзідэнцкую кампанію (арганізаваць новы энергетычны канфлікт, прыстрашыць не прызнаць вынікі выбараў і г. д.), каб ён стаў яшчэ больш згаворлівым, аднак да радыкальных крокаў, верагодней за ўсё, звяртацца не будзе.

**УНІАН (Украіна)**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас візіту ў Турцыю сустрэўся з патрыярхам Канстанцінопальскім Варфаламеем. З крыніцы ў асяроддзі мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, экзарха Беларусі, стала вядома, што прэзідэнт Лукашэнка абмяркоўваў з Сусветным Патрыярхам магчымасць аўтакефаліі для Беларускай праваслаўнай царквы. Назіральнікі ўпэўненыя, што магчымасць аўтакефаліі для БПЦ вельмі спрэчная, але тое, што прэзідэнт Лукашэнка пра гэта загаварыў, — сур'ёзны «званочак» для Маскоўскага патрыярха і, адпаведна, для кіраўніцтва Крамля… Ведаючы незалежны характар беларускага прэзідэнта, можна выказаць здагадку, што ён не стане занадта стрымліваць сябе, умешваючыся ў справы царквы. І калі палітычная сітуацыя запатрабуе, у яго цалкам можа хапіць рашучасці на абвяшчэнне аўтакефаліі.

**«Дзеркало тижня» (Украіна)**

Калі вы ідзяце ў Еўропу, то прыходзіце ў цэнтр Еўропы. Мы будзем вам актыўна дапамагаць і падтрымліваць у Беларусі», — заявіў ён (Лукашэнка) кітайцам і зрабіў ім прапанову, ад якой, па яго разуменні, яны наўрад ці змогуць адмовіцца. «Мы маем унікальнае становішча ў Мытным саюзе… Вы зможаце бязмытна гандляваць фактычна на ўсёй тэрыторыі постсавецкай прасторы». Прасцей кажучы, Лукашэнка адкрытым тэкстам прапанаваў Кітаю свае паслугі па распаўсюду кантрабандных тавараў на тэрыторыі адзінай мытнай прасторы. Наўрад ці ён пры гэтым раіўся з лідэрамі Расіі і Казахстану. Як удзельнікі Мытнага саюзу адрэагуюць на гэты крок беларускага прэзідэнта — пакажа час. Магчыма, ім застанецца спадзявацца толькі на разважлівасць кітайцаў. Але ўжо цяпер ясна, што, ратуючы сябе асабіста, Лукашэнка здольны прадаць не толькі сваю краіну.

**«Новая палітыка» (Расія)**

Тое, што з Лукашэнкам можна дамовіцца, паказала гісторыя ўступлення Беларусі ў Мытны саюз. Ён доўга ўпіраўся і патрабаваў бязмытнай расійскай нафты, аднак Расія не саступіла, арганізавала газавы канфлікт і ўрэшце прымусіла Аляксандра Рыгоравіча прыняць яе ўмовы. Такім чынам, можна выказаць здагадку, што рана ці позна Масква ў адносінах з Беларуссю ўсё ж даб'ецца свайго, паколькі ў Лукашэнкі папросту няма іншага выбару, калі ён хоча і далей заставацца ва ўладзе. Захад жа ў гэту справу ўмешваецца не стане, таму што лічыць Беларусь зонай уплыву Расіі.

**«Geopolitika» (Літва)**

Беларусь для шмат каго — як казачнае Белаводдзе, міфічны салодкі міраж, легендарная Атлантыда, аазіс у пустыні, запаведнік чысціні і парадку на фоне расійскага бардаку, карупцыі і бюракратычнага бязмежжа... Мне вельмі зразумелая і чымсьці нават блізкая гэта саўковая настальгія. Але ўжо занадта свежыя ўспаміны пра тое, што хавалася за савецкімі чысцінёй і парадкам, нават у самыя бяскроўныя застойныя часы: дастаткова ўзяць падшыўку старых газет, перагартаць іх — і адразу развеецца ідылія. Калі, вядома, для вас такія словы, як «свабода», — не пусты гук.

**«Красноярский рабочий» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. ПАРТЫЯ РЭГІЁНАЎ БУДУЕ САЦЫЯЛІЗМ

Аказваецца, кіруючая ва Украіне Партыя рэгіёнаў ідэальнай формай грамадскага ладу лічыць сацыялізм. Інакш бы яна не падпісала мемарандум пра супрацоўніцтва з «Прагрэсіўным альянсам сацыялістаў і дэмакратаў» — фракцыяй у Еўрапарламенце. Касцяк Альянсу складаюць сябры сацыялістычных і сацыял-дэмакратычных партый. Здавалася, цяжка знайсці ва Украіне партыю, якая была б так далёка ад прынцыпаў левага руху. Партыя рэгіёнаў — гэта партыя вялікага бізнесу. Палітолагі, аднак, лічаць, што Азараў (старшыня партыі) кіраваўся простай логікай. Паколькі партыя «Батьківщина» (лідэр Юлія Цімашэнка) з'яўляецца сябрам кансерватыўнай Еўрапейскай народнай партыі, Партыі рэгіёнаў нічога не заставалася, як перафарбавацца ў чырвоны колер.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### КУБА. ЮБІЛЕЙ САМАЙ МАСАВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Куба святкуе гадавіну стварэння руху Камітэт па абароне рэвалюцыі (CDR). Роўна 50 гадоў таму ў кастрычніку 1960-га Фідэль Кастра заклікаў да стварэння дваравых камітэтаў, якія павінны былі абараняць прынцыпы рэвалюцыі ў выпадку магчымай інтэрвенцыі янкі. Аднак, паколькі янкі да гэтага часу не атакуюць, CDR паступова заняўся грамадска-палітычнай дзейнасцю. Сёння гэта самая масавая праўладная арганізацыя, уступаць у якую можна з 14 гадоў. Зразумела, што не ўступіць у CDR напросту не магчыма. Арганізацыя, якая налічвае 7 мільёнаў 600 тысяч чалавек, будуецца па квартальнаму прынцыпу. Як правіла, актывісты CDR занятыя рамонтам будынкаў і дарог, дапамагаюць старым і пенсіянерам. У свой час рух адыграў вялікую ролю ў ліквідацыі непісьменнасці на Кубе. З іншага боку, Камітэт па абароне рэвалюцыі з'яўляюцца нізавой структурай сістэмы палітычнага нагляду. Яго лідэры павінны інфармаваць адпаведныя органы пра любую крамолу ў сваім раёне. Таксама праваабаронцам не падабаецца практыка грамадскіх судоў, якія арганізуе Камітэт па абароне рэвалюцыі. Падчас іх кожны сябра CDR павінен асудзіць чалавека, які ў чымсьці правініўся. Праваабаронцы лічаць гэта псіхалагічным ціскам.

**Па матэрыялах кубінскай прэсы**

### ІЗРАІЛЬ. КЛЯТВА ВЕРНАСЦІ ДЗЯРЖАВЕ

Ізраільскае грамадства спрабуе зразумець сутнасць прынятага 10 кастрычніка закона, адпаведна якому кожны грамадзянін краіны неяўрэйскага паходжання мусіць прынесці клятву вернасці ізраільскай дэмакратычнай дзяржаве. Праўда, закон яшчэ павінен быць падтрыманы Кнесетам. Нават палітыкі, якія не адносяць сябе да лагеру левай апазіцыі, згодныя, што тут ёсць нейкі элемент расісцкай тэорыі, аўтары якой сцвярджаюць, што нацыянальнасць вызначае палітычную пазіцыю. Ліберальная газета «Haaret» увогуле напісала, што «пасля 10 кастрычніка мы будзем жыць у афіцыйна прызнаным этнакратычнай, тэакратычнай і расісцкай краіне». Хутчэй за ўсё, прэм'ер кідае костку правым партыям, без згоды якіх не будзе забаронена будаўніцтва яўрэйскіх пасяленняў на палесцінскіх землях. Гэта ключавая ўмова для працягу мірнага дыялогу з арабамі.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ЛЕЙБАРЫСТ ПАЦЯРПЕЎ ПРАЗ ГЕНІТАЛІІ

Калі былому мэру Лондана, лейбарысту Кену Лівінгстону прапанавалі сустрэцца з Юсуфам аль-Карадаві, адным з лідэраў апазіцыі ў Егіпце, ён адразу згадзіўся. Лівінгстон марыць вярнуць пасаду гарадскога галавы, і галасы лонданцаў ісламскага веравызнання яму будуць вельмі патрэбныя. Палітык і госць сустрэліся і разам сфатаграфаваліся для прэсы. Але феміністкі высветлілі, што Юсуф падтрымлівае практыку жаночага абразання. Па стане на 2008 год, ад 100 да 140 мільёнаў жанчын у свеце жылі з наступствамі гэтай аперацыі, якая павінна быццам пазбавіць іх сексуальнага жадання і гарантаваць моцнасць сям'і. Юсуф таксама так думае. У сваёй фатве ён напісаў, што абразанне «робіць жанчыну больш здаровай і спрыяе добрым сувязям з мужам». «Ці можа пасля гэтага Лівінгстон лічыць сябе левым палітыкам?» — задаюць пытанне актывісткі жаночых арганізацый і патрабуюць ад яго асуджэння патрыярхальных перажыткаў.

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### ФРАНЦЫЯ. ХТО БУДЗЕ ГАЛОЎНЫМ НАЦЫЯНАЛІСТАМ?

Уся супольнасць французскіх ультраправых жыве будучым з'ездам партыі Нацыянальны фронт. Дэпутаты з'езда, які прызначаны на студзень, павінны абраць новага старшыню. Нязменны Жан Мары Ле Пэн збіраецца на пенсію. Галоўнымі кандыдатамі на вакантную пасаду лічацца яго дачка Марына і стары партыйны актывіст прафесар Бруна Гальніш. Пры гэтым меркавалася, што старшынства ў Марыны амаль у кішэні. Але зараз Бруна нечакана ажывіўся. Ён пераманіў на свой бок усю правую прэсу, якая развярнула супраць сям'і Ле Пэн сапраўдную медыявайну. Галоўны штотыднёвік правых «Minute» піша, што ў выпадку перамогі Марыны апарат партыі чакае «Варфаламееўская ноч». Газета «Rivarol» сцвярджае, што Ле Пэн і ягоная дачка рыхтуюць масавыя фальсіфікацыі выбараў старшыні. Ветэраны вайны ў Алжыры таксама нечакана падтрымалі прафесара. Так ці інакш, зараз вынік выбараў ужо не так проста прагназаваць.

**Па матэрыялах «Liberation» (Францыя)**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ АДКЛАДАЕЦЦА

*Алег ПЯТРОЎ*

**Шатландскія нацыяналісты адклалі правядзенне рэферэндуму пра пачатак выхаду Шатландыі са складу Аб'яднанага Каралеўства.**




Змрочную для ўсіх аматараў незалежнай Шатландыі навіну агучыў Алекс Салмонд, прэм'ер-міністр ураду Шатландыі і лідэр Шатландскай нацыянальнай партыі (SNP). Выступаючы на партыйнай канферэнцыі, Салмонд заявіў, што вымушаны з-за аб'ектыўных прычын перанесці на больш далёкі тэрмін рэалізацыю мары ўсяго свайго жыцця — аднаўленне дзяржаўнасці Шатландыі (краіна страціла яе, калі ў 1707 годзе быў прыняты Акт аб уніі з Англіяй).

Шлях да адраджэння незалежнай Шатландыі ляжаў праз рэферэндум, які збіраліся правесці ў лістападзе. Увогуле, ідэя такога рэферэндуму была агучаная ў 1997 годзе — адразу, як толькі Шатландыя атрымала свой парламент.

Аднак канкрэтныя контуры план пачаў набываць у 2007 годзе, калі SNP паклала канец амаль 50-гадоваму дамінаванню лейбарыстаў у мясцовай адміністрацыі. Па выніках выбараў партыя Салмонда атрымала на адзін мандат больш за лейбарыстаў, што дало ёй права стварыць урад. Нягледзячы на тое, што гэты ўрад — урад меншасці (у фракцыі SNP 47 з 129 сябраў дэпутацкага корпусу), нацыяналісты да гэтага часу здолелі пазбегнуць урадавых крызісаў. Адначасова праводзіліся рэформы на карысць незалежніцкага праекта. Напрыклад, на дзяржаўным узроўні пачалася кампанія за стварэнне ў інтэрнэце пашырэння «sco» (ад Scotland — Шатландыя).

Але апагеем праўлення нацыяналізму павінен быў стаць рэферэндум, пра які абвясцілі ў жніўні 2009 года. Яго прызначылі на 30 лістапада 2010 года — на дзень Святога Андрэя (святы патрон Шатландыі).

У лютым з'явіўся дакумент пра падрабязнасці правядзенне плебісцыту. Калі б рэферэндум усё ж адбыўся, то кожны жыхар Шатландыі мусіў адказаць на два пытанні: 1) Ці падтрымліваеце Вы пашырэнне кампетэнцыі шатландскага парламенту, перш за ўсё у сферы фіскальнай палітыкі? 2) Ці мае, на Вашу думку, парламент права дабівацца поўнай незалежнасці?

У выпадку, калі б на абодва пытанні выбарцы аказалі «не», усё б заставалася па-ранейшаму. Калі б большасць прыняла толькі першае пытанне, Шатландыя атрымлівала б «міні-незалежнасць». На тэрыторыі Вялікабрытаніі стваралася б асобная падатковая і эканамічная зона, правілы якой вызначаў бы Эдынбург.




Калі б народ Шатландыі падтрымаў абодва пытанні, пачаўся б працэс паступовага ператварэння краю ў «нармальную суверэнную дзяржаву», фармальным кіраўніком якой заставалася б усё ж каралева Елізавета Другая. Шатландыя мела б магчымасць стаць сябрам ЕС і ў перспектыве перайсці на еўра.

Усе амбіцыйныя планы, як прызнаюцца самі нацыяналісты, сарваў пракляты крызіс. Ён моцна ўдарыў па Шатландыі. Кожны тыдзень, адпаведна статыстыцы, тысяча шатландцаў губляе працоўныя месцы. Калі ў сярэднім па Вялікабрытаніі беспрацоўе складае 7 працэнтаў, то ў Шатландцы — амаль 9 працэнтаў. У такіх умовах Эдынбург залежыць ад датацый з Лондану. Такі стан рэчаў, натуральна, выклікае ў людзей недавер да тэзісу пра тое, што незалежнасць — сінонім дабрабыту.

> **Канкрэтныя контуры план пачаў набываць у 2007 годзе, калі SNP паклала канец амаль 50-гадоваму дамінаванню лейбарыстаў у мясцовай адміністрацыі**

Акрамя таго, раней у сваёй агітацыі нацыяналісты адводзілі значнае месца прыкладу Ірландыі і Ісландыі (гэтыя маленькія краіны да пачатку эканамічнага краху дэманстравалі добрыя эканамічныя паказнікі). Абывацелю навязвалі думку пра тое, што Шатландыя, якая ў дадатак да ўсяго мае радовішчы марской нафты і газу, можа паўтарыць поспех суседзяў. Аднак, як толькі пачаўся крызіс, ірландская і ісландская эканомікі абрынуліся ў галечу. Разам з імі згубіў прывабнасць і шатландскі нацыяналістычны міф.

Адным словам, для правядзення лёсавызначальнага рэферэндуму зараз аб'ектыўна не лепшыя часы.

У дадатак, на шляху да рэферэндуму была яшчэ адна перашкода. Для прыняцця закону аб рэферэндуме патрэбна большасць галасоў у парламенце. За тры гады прэм'ерства Салмонд навучыўся праводзіць свае законапраекты за кошт стварэння часовых кааліцый. Аднак з гэтай незалежнасці так не атрымаецца.

Ёсць розныя прычыны для супраціву ідэі незалежнасці. Лейбарысты кажуць, што час для поўнай самастойнасці яшчэ не прыйшоў. Ліберал-дэмакраты і кансерватары наогул сцвярджаюць, што рэферэндум не адпавядае нормам брытанскага права.

Хаця ад ідэі рэферэндуму лідэры SNP цалкам не адмаўляюцца, яны абяцаюць, што закон пра рэферэндум аб незалежнасці будзе вынесены на агульнае апытанне пасля прызначаных на май 2011 года выбараў у мясцовы парламент. Зразумела, пры ўмове, што на іх пераможа SNP.

Аднак зрабіць паўтор выбараў 2007-га нацыяналістам будзе цяжка. Фаварытамі наступных выбараў лічацца лейбарысты, якія, па апытаннях, апярэджваюць нацыяналістаў амаль на дзесяць пунктаў. І зламаць гэту тэндэнцыю SNP будзе цяжка. Справа ў тым, што адной з галоўных тэмаў выбараў стане праграма мадэрнізацыі атамных ракетных комплексаў «Trident», якія знаходзяцца на шатландскіх вайсковых базах. Менавіта на лозунгах вываду атамнай зброі з Шатландыі традыцыйна будуецца тутэйшы нацыянальны рух. Аднак ва ўмовах крызісу сітуацыя выглядае трошкі іншай. Праект мадэрнізацыі «Trident» забяспечвае працоўнымі месцамі 40 тысяч шатландскіх працоўных. У часы крызісу шмат для каго гэта добры аргумент, каб на нейкі час забыць пра незалежнасць.

ГЕАПАЛІТЫКА

# АФРЫКАНСКАЕ ПРЫДНЯСТРОЎЕ

Алег НОВІКАЎ

**У непрызнанай міжнародным грамадствам афрыканскай краіне Самалілэнд па выніках выбараў адбылася мірная перадача ўлады апазіцыі. Выпадак для афрыканскіх шыротаў незвычайны.**

Сітуацыя, сапраўды, не кладзецца ў рамкі звычайных катэгорый. Дзяржавы, якія не прызнае міжнародная супольнасць, як правіла, уяўляюць закамуфляваныя фармальным дэмакратычным заканадаўствам дыктатуры. У лепшым выпадку, аўтарытарныя рэжымы. Дастаткова згадаць Паўднёвую Асецію або Прыднястроўе. Самалілэнд таксама належыць да «чорных дзірак на мапе» — так у прэсе метафарычна называюць непрызнаныя краіны.

Увогуле, сваім з'яўленнем Самалілэнд абавязаны перш за ўсё брытанскай каланіяльнай культуры. Калі напрыканцы XIX стагоддзя ў рэгіён прыйшлі каланізатары (Вялікабрытанія і Італія), самалійскія мясцовыя плямёны былі больш-менш падобныя адзін на аднаго.

Іншаземцы падзялілі не толькі іх зямлю, аднак і стварылі два сацыя-культурныя тыпы самалійскага народа — паўночны і паўднёвы. На поўначы панавалі брытанцы. Для іх краіна Самалі не мела вялікага значэння. Хіба што кантроль над гэтай часткай Афрыкі павінен быў паслабіць геапалітычны ўплыў французаў на Чырвоным моры. Брытанская палітыка стаўлення да тутэйшых заключалася ў тым, каб адаптаваць іх архаічныя міжкланавыя механізмы падтрымання грамадскай стабільнасці да брытанскага права.

На поўдні панавалі італьянцы. Каланіяльная палітыка Рыму, асабліва ў часы Дучэ, была своеасаблівай кампенсацыяй за нізкі статус Італіі ў Еўропе. Італьянцы намагаліся адбудаваць вертыкальную структуру кіравання без хоцьнейкай павагі да традыцыйных кланавых структур. Такое ўяўленне пра мадэль дзяржавы было прынятае і першымі тубыльнымі палітыкамі пасля абвяшчэння незалежнасці ў 1960 годзе.

Як толькі Поўнач і Поўдзень сталі свабоднымі, адразу ўзнікла ідэя Вялікай Самалі. Хутка ўніфікацыя экс-калоній адбылася. Аднак на гэтым будаўніцтва новай дзяржавы не прыпынілася. Яе бацькі-заснавальнікі заявілі, што не прызнаюць межаў дзяржаў, якія ўстанавілі каланізатары.

На думку самалійскага ўраду, у склад Вялікай Самалі павінен быў таксама ўваходзіць Агадэн (частка тэрыторыі Эфіопіі). У 1977 годзе пад кіраўніцтвам Махамеда Сіад Бaррэ самалійцы справакавалі паўстанне народу Агадэна і аказалі яму вайсковую дапамогу. Вайна закончылася правалам. Каля мільёна бежанцаў, ахвяр канфлікту, пацягнуліся ў Самалі.

Не жадаючы прызнаць факт краху праекту Вялікага Самалі, Бaррэ вырашыў ператварыць уцекачоў у зброю для рэваншу. Ён пасяліў іх на Поўначы краіны ў спецыяльныя лагеры, дзе яны павінны былі прайсці баявую падрыхтоўку. Часткова кошты за ўтрыманне лагераў пераклалі на паўночныя плямёны, што выклікала першыя прыкметы фронды.

У 1981 годзе на Поўначы пачалося паўстанне. На дзесяць гадоў краіна пагрузілася ў хаос грамадзянскай вайны. Праз дзесяцігоддзе самалійскай дзяржавы дэ-факта больш не было. На яе месцы ўзнік кангламерат тэрыторый, кожную з якіх кантраляваў асобны клан або палявы камандзір. Наступствам адсутнасці ўраду стаў масавы голад, што прымусіла ЗША ў 1992 годзе з санкцыі ААН увесці сюды вайсковы корпус колькасцю 35 тысяч чалавек. Аперацыя «Restore hope», адпаведна плану, мела дзве фазы: поўная акупацыя Самалі і стварэнне падмурку для дзяржаўных інстытутаў.

Аднак нічога зрабіць не ўдалося. Праз два гады амерыканцы з'ехалі. З 1995 года было зафіксавана 14 спробаў (!) стварыць на Поўдні нейкае падабенства ўрадавай адміністрацыі. Усе яны закончыліся правалам.

А вось на Поўначы працэс дзяржаўнага будаўніцтва пачаўся. Лідэры паўночных кланаў аб'ядналіся ў shir (савет), які абвясціў пра стварэнне асобнай дзяржавы ў межах былой брытанскай Самалі. Дзяржава ўяўляе сабой гібрыдную сістэму праўлення. Канстытуцыя сумяшчае ў сабе традыцыі мясцовых звычаяў і заходнееўрапейскія нормы кіравання. Праз серыю міжкланавых сходаў і канферэнцый, кульмінацыяй якіх у 1993 годзе стала Бурамская канферэнцыя (па-англійску — Boorama Conference), была створана сістэма кіравання «кабіл» (самал. qabil — клан або супольнасць). Дадзеная сістэма складаецца з выканаўчага органа: прэзідэнта, віцэ-прэзідэнта, савета міністраў і незалежнай судовай сістэмы.

Урадам стала аснова кааліцыі пануючых кланаў, з месцамі ў верхняй і ніжняй палатах, роўна падзеленымі паміж кланамі ў адпаведнасці з выразна акрэсленай формулай. У 2002 годзе, пасля некалькіх пашыраннняў гэтай сістэмы ўнутранага кіравання, Самалілэнд нарэшце перайшоў да шматпартыйнай дэмакратычнай формы праўлення, з выбарамі раённага савета, які складаецца з шасці партый. Такая сістэма кіравання прызнана самай мірнай за апошнія дзвацаць гадоў у Афрыцы.

Сітуацыю цяжка назваць ідэальнай, аднак нават па мерках некаторых усходнееўрапейскіх краін яна папросту звышліберальная. Так, 2009 годзе прэзідэнт Самалілэнда Рыйяль Кахін загадаў міністру абароны вывесці войскі на вуліцы сталіцы краіны, каб супрацьстаяць антыўрадавым маніфестацыям. Вайсковец пасля некаторай паўзы адказаў, што ў такім выпадку яго ня ўчынкі будуць супярэчыць канстытуцыі. Прэзідэнт быў вымушаны абвясціць датэрміновыя выбары, на якіх улетку 2010 года прайграў. На днях новы прэзідэнт Ахмед Маха Сіланья заняў яго офіс.

Апошнія поспехі дэмакратыі Самалілэнда ставяць міжнародныя цэнтры — Лондан, Парыж і Вашынгтон — у тупік. З аднаго боку, ім было б лагічна падтрымаць востраў міра і стабільнасці. З іншага — яны не хочуць сварыцца з Егіптам. У Каіры і ў арабскім свеце недалюбліваюць хрысціянскую Эфіопію, якая мае традыцыйна добрыя адносіны з Самалілэндам. Раней у Самалілэндзе кіравала эфіопская дынастыя.

Таму арабы выступаюць за адраджэнне адзінага Самалі як патэнцыйнага саюзніка супраць Эфіопіі. Сварыцца з арабскім светам з-за Самалілэнда на Захадзе, натуральна, не збіраюцца.




## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДАНІЭЛА САНТАНКЕ



Дэпутату італьянскага парламенту ад партыі «Народ Свабоды», лідэрам якой з'яўляецца Сільвія Берлусконі, вырашылі даручыць незвычайную, аднак надзвычай важную місію. Яна павінна стаць італьянскай Сарай Пэйлін (лідэр «Tea Party» — кансерватыўнай фракцыі ў Партыі рэспубліканцаў ЗША). Сара і яе прыхільнікі зрабілі сапраўдную рэвалюцыю па той бок акіяну, стаўшы лідэрамі апазіцыі адміністрацыі Абамы. Цяпер мадэль «Tea Party» было вырашана імпартаваць у Італію. Робіць Берлусконі, праўда, такі крок не ад добрага жыцця. Апошні месяц грамадскасць стала сведкам яго канфлікту з былым заступнікам Джанфранка Фіні. У выніку той пайшоў з «Народу Свабоды», каб стварыць сваю партыю, якая павінна заняць у італьянскім партыйным спектры месца на правым цэнтры. Цалкам рэальна, што Фіні зможа ў перспектыве блакіравацца з левымі, якія ўжо заявілі пра гатоўнасць пайсці на любыя пакты ў барацьбе супраць Берлусконі, які, на іх думку, увасабляе карупцыйную амаральную палітыку. У такой сітуацыі Сільвія патрэбна захаваць за сабой правы электарат. Паколькі сам ён з'яўляецца героем шматлікіх сексуальных скандалаў, і каталікі ад яго не ў захапленні, да справы падключылі Даніэлу. Апошняя мае ў грамадстве імідж каталіцкай фундаменталісткі. Цікава, што Даніэла і яе цяперашні галоўны вораг Фіні пачыналі разам у партыі «Нацыянальны альянс», што з'яўляецца нашчадкам Партыі фашыстаў Італіі.

### АМУРБЕК ТЭКЕБАЕЎ



Лідэр кіргізскай партыі «Ата-Мекен» стаў наступным сябрам дзіўнага клубу, куды раней увайшлі Юры Лужкоў, Муртаза Рахімаў, Аляксандр Лукашэнка. Іншымі словамі, гаворка пра асобаў, якія чымсьці не спадабаліся Крамлю і супраць якіх вяліся інфармацыйныя войны. Цяпер на НТВ заняліся Амурбекам. У прысвечаным яго асобе фільме Амурбек паказаны як заўзяты карупцыянер. Палітолагі шукаюць прычыны медыя-атакі на Тэкебаева ў сітуацыі, якая склалася пасля нядаўніх парламенцкіх выбараў. Па іх выніках адносную большасць у парламенце атрымала «паўднёвая» партыя «Ата Журт» (30 мандатаў з 120). Між тым, партыі сацыял-дэмакратаў, «Рэспубліка» і «Ар-Намыс», якія, на думку прэсы, фінансаваліся з Масквы і Астаны, маюць 70 мандатаў. Думаецца, што Тэкебаеў нейкім чынам замінае будаўніцтву дэпутацкай большасці пад новы прарасійскі ўрад, за што і стаў ахвярай НТВ. Ягонай рэакцыяй на фільм, дарэчы, стала патрабаванне да цяперашняга часовага ўраду прыпыніць умяшанне замежных дзяржаў ва ўнутраныя палітычныя працэсы ў Кіргізіі.

### ПЕРВЕЗ МУШАРАФ



Пакістанскі генерал, былы дыктатар, які ў 2008 годзе добраахвотна склаў паўнамоцтвы прэзідэнта і пакінуў краіну, цяпер марыць вярнуцца, прычым як вельмі перспектыўны палітык. У Лондане Мушараф абвясціў пра стварэнне ўласнай партыі «Усепакістанская мусульманская ліга» (APML). Яго першыя заявы і крокі вайскоўца выклікалі міжнародны землятрус. Генерал прызнаўся, што Пакістан трэніруе атрады кашмірскіх сепаратыстаў і закідвае іх у Індыю. Афіцыйны Дэлі вуснамі міністра абароны патрабаваў ад міжнароднай супольнасці і ЗША перш за ўсё аказаць ціск на пакістанскія ўлады. У сваю чаргу, Пакістан адразу даў зразумець, чаму будзе каштаваць падобны ціск. Пакістанскія ўлады канфіскавалі вялікую партыю вайсковага грузу NATO, які транзітам ішоў салдатам Альянсу ў Афганістан. У дадатак талібы на нейкі час перасталі атакаваць «блакітныя каскі». Сэнс паслання відавочны: у Ісламабада ёсць механізмы ўплываць на афганскіх ісламістаў. Такім чынам, Захаду, калі ён хоча як мага хутчэй закончыць аперацыю ў Афганістане, трэба дамаўляцца з пакістанцамі, а не крытыкаваць іх за падтрымку кашмірскіх сепаратыстаў. Увогуле, на думку шматкаго, вяртанне Мушарафа ў палітыку звязана менавіта з афганскай тэмай. Калі ў наступным годзе часткі NATO, як плануецца, пакінуць Афганістан, менавіта Пакістан будзе галоўным рэгіянальным праціўнікам Аль Каіды. Мушараф сёння жадае давесці Захаду, што ён выканае гэтую ролю лепш за цяперашні пакістанскі ўрад.

▸ КІНО

# «ВАЎКІ»: УЦЁКІ З БЕЛАРУСКАЙ ЗОНЫ





www.belarusfilm.by

Андрэй РАСІНСКІ

**Карціна Аляксандра Колбышава «Ваўкі» скаланулі мяне яшчэ да свайго выхаду на экраны. У кадрах рэкламнага ролiку (упершыню для «Беларусьфільма» выстаўленага ў сеціве!) — трагічныя ўцёкі з ГУЛАГу. У краіне, дзе школьнікаў возяць на Лінію Сталіна, з'явілася падкрэслена антытаталітарная стужка.**

Сюжэт фільму просты. На занесенай снегам станцыі «Вярыга» спыняецца эшалон з вязнямі. Арыштант Кірыл Палятаеў уцякае ад канвою — і хаваецца ў роднай вёсцы, што паблізу. Адны месцічы дапамагаюць герою, другія — мараць яго схапіць. Сталінскія карнікі абвяшчаюць, што рэпрэсуюць усю вёску, калі ўцякач не знойдзецца. Герой мяркуе здацца, але ў лесе яго загрызаюць ваўкі.

Ваўчынае паляванне на чалавек нагадвае «Аблаву» Васіля Быкава. Але аповесць, па якой складзены фільм, напісаная яшчэ ў 1963 годзе. Аляксандр Чакмянёў, беларускі сцэнарыст ды рэжысёр, тады спрабаваў надрукаваць твор. Але аўтара выклікалі ў КДБ і абяцалі сур'ёзныя непрыемнасці. Гісторыя, якая «ачарняе светлы вобраз» карнай машыны, пабачыла свет толькі на пачатку 2000-х гадоў.

Аповесць захапіла акцёра і рэжысёра Аляксандра Колбышава, але ён згубіў надзею паставіць хоць нешта на «Беларусьфільме», таму працаваў у Расіі на серыялах.

«Нечакана мне патэлефанавалі з кінастудыі, — распавядае Колбышаў. — Сказалі, што ў нас новы дырэктар Замяталін, прапануйце сцэнар. Я даслаў сцэнар «Ваўкоў», які падаваўся мне на нашай кінастудыі непрахадным. А мне сказалі запускацца з карцінай».

Фільм быў дароблены напрыканцы 2009 года. Яго прапаноўвалі на Берлінскі кінафэст, дэманстравалі на фестывалях СНД. З кастрычніка 2010 карціна пайшла ў шырокім беларускім пракаце.

Але фільм ужо папракнулі, што ён «несвоечасовы» і «небеларускі». Папрокі гэтыя вельмі няслушныя. Стужка — дакладны адбітак нашага часу, партрэт беларускіх прыцемак перад досвіткам. Трагедыя, што разыгралася на экране ў далёкай сібірскай вёсцы, — пра нас, пра слабасць і моц людзей. І нават хібы карціны сведчаць пра наша грамадства.

Аляксандра Колбышава беларускія гледачы найперш ведаюць як акцёра. Спачатку творца працаваў у Брэсцкім драматычным тэатры. Ягоны зухаваты кінапартызан Штыркін з «Акупацыі» Кудзіненкі — трагікамічны выхваляка, які на экране паміраe і ўваскрасае. Сур'ёзна-пацешная і роля святара-паўстанца ў «Масакры», якую гледачы неўзабаве пабачаць.

Але вучань Віктара Турава рэжысёр Колбышаў — творца трагічных гісторый. Ягоны почырк — суворы, акадэмічны і стрыманы. Ён надае ўвагу акцёрскай гульні, дакладнаму псіхалагічнаму малюнку ролі. Колеры і дэкарацыі ў кадры не мусяць адцягваць увагі ад рухаў чалавечай душы.

Герой ранняй кароткаметражнай стужкі «Чорная скрыня» — ветэран Афганістану, якога не адпускае боль (сам рэжысёр таксама прайшоў праз Афганістан). А аскетычная бела-чорная карціна «Ахвота жыць», пастаўленая ў 1998 годзе па апавяданні Васіля Шукшына, прадказвае «Ваўкоў». У фільме таежны паляўнічы сустракае хлопца, які ўцёк з калоніі.

Сярод «трагічных» крыніц «Ваўкоў» можна назваць і «Узыходжанне» Ларысы Шапіцькі (паводле «Сотнікава» Васіля Быкава), тым болей, што з гэтай карціны перавандраваў у стужку Колбышава Уладзімір Гасцюхін. Ягоны ўдзел у фільме таксама не спадабаўся заўзятарам палітычнай чысціні.

Але на экране ўсё вымяраецца талентам. Гасцюхін абсалютна на сваім месцы. Сябра Кірыла Палятаева, які просіць яго здацца, дагаджае гэбісцкаму карніку ды губляецца — гэта варыяцыя каронная «рыбакоўскай тэмы», што прынесла акцёру славу.

Дарэчы, Гасцюхін ужо зняўся ў беларускіх «Ваўках» у… 1977 годзе. Гэта была навела ў кінаальманаху «У профіль і анфас», пастаўленая паводле Васіля Шукшына.

З асалодай грае падступнага гэбіста, галоўнага «паляўнічага», Андрэй Панін. Ледзяны пранізлівы позірк, рэзкія жэсты — і кашаль з соплямі. У жалезнага камуніста Вячаслава Паўлюця таксама «недасканаласць» — толькі адна рука. А вясковая даносчыца (у выкананні Аксаны Лясной) — высушаная ад страху і партыйнага экстазу.

Колбышаў пераўтварае сцэну з яе допытам у амаль хічкокаўскае відовішча. Зляканае падтакванне, пытанні-пасткі, расквечаныя дробным кашлем злобнага следчага, — і лісліва-шчасныя вочы зацкаванай даносчыцы. Спачатку ў сцэне была процьма словаў. Але рэжысёр папрасіў актрысу: «А цяпер сыграй гэта аднымі вачыма». І яна сыграла.

Колбышаў не засяроджваецца на гратэскных рысах адданых савецкіх вінцікаў. Гэта звычайныя людзі са сваімі жарсцямі і хваробамі. Але карная машына, што абвяшчае сябе ўсемагутнай, неўпрыкмет падточана іржою.

Зарука савецкага скону — жывыя і непасрэдныя дзеці, якія не баяцца дапамагаць «ворагу». Дзіцячыя ролі, увогуле, наймацнейшыя ў фільме. Прататыпам хлопчыка Шуркі, якога сыграў Коля Спірыдонаў, стаўся сам аўтар аповесці Аляксандр Чакмянёў. А Дыяна Запрудская (якая ў беларускай казцы, што мае з'явіцца налета, — прынцэса) — у фільме Колбышава няўрымслівая шапялявая дзяўчынка.

На тле пераследнікаў і выратавальнікаў губляецца сам галоўны герой (Дзмітрый Ульянаў). Ён не дзейнічае, ён пазбягае выбару і — што зусім недаравальна для трагедыі — ён перакладае адказнасць на іншых. Галоўны герой — гэта правісанне і затрымка сюжэту, невытлумачальная дзірка ў апавяданні. І праблема тут зусім не ў акцёры.

Менавіта такі і наш час, які спыніўся на 16 гадоў. Дзесьці там святло. Аднак антысталінскія сюжэты ўсё яшчэ актуальныя.

Мы ўжо ўцяклі з ГУЛАГаўскага эшалону, але ўсё яшчэ абкладзеныя ваўкамі ўласных страхаў.

Мы ўжо выйшлі на шлях, але баімся зрабіць крок — і вакол сцюжа.

Мы прагнем свабоды, але па нявольніцкай звычцы перакладаем сваё вызваленне на іншых. Патавая сітуацыя: вязні не здольныя быць на волі, турэмшчыкі не здольныя іх злавіць.

Кірыл Палятаеў — кананічны тутэйшы, апеты ў шматлікіх жаллівых гутарках. Чалавек-трава з непераадольнай «ахвотаю жыць», які дзеля гэтай ахвоты адмаўляецца ад усялякае пэўнасці.

Але выбар зрабіць неабходна. Выбар, які пераўтворыць зіму ў вясну.

На экране — шэра-сцюдзёнае насланнё, падкрэсленае чырвона-крывавымі плямамі савецкіх сцягоў (трагедыйная светлапісь аператара Паўла Зубрыцкага). За кадрам дзяўчынка шапялявым голасам шэпча малітву: «Даруй нам, Госпадзі… Выратуй нас, Госпадзі… і — захавай нас, Госпадзі, таму што мы людзі, а не звяры…» Кранальную малітву склаў дырэктар кінастудыі Уладзімір Замяталін, якога зусім нядаўна запісвалі ў «ворагі нацыянальнай культуры».

Беларусь змяняецца.

▸ КІНАКЛУБ

# АКТУАЛЬНЫЯ ФАНТАЗІІ САВЕЦКІХ ДЗЁН

Андрэй КРЫНІЦЫН

**У кінатэатры «Ракета» з 5 кастрычніка па 9 лістапада кінаклуб «Феномены кіно» прадстаўляе праграму «Савецкі Фантазіум», прысвечаную містычным і фантастычным стужкам савецкага кіно.**

У праграме ўжо была паказаная стужка «Салярыс» Андрэя Таркоўскага, дэманструецца і рарытэтная «Дзіўная гісторыя містэра Джэкіла і доктара Гайда» з Інакенціем Смактуноўскім, і постапакаліптычная карціна Канстанціна Лапушанскага «Лісты мёртвага чалавека» (1986 год). Гэта стужка ў свой час выклікала ў гледачоў шок. Пасля ядзернай вайны загінула большая частка чалавецтва. Ягоныя рэшткі хаваюцца ў бункерах і чакаюць радыеактыўнай зімы. Стары навуковец (адна з апошніх роляў Ралана Быкава) складае лісты памерламу сыну.

Чорна-беламу насланню «мёртвага чалавека» супрацьпастаўлены фарсавы «Горад Зэра» Карэна Шахназарава. Гэта стужка 1988 года з Леанідам Філатавым і Алегам Басілашвілі распавядае пра горад, які выпаў з часу — і ніяк не здольны развітацца з навязлівымі фантомамі злой мінуўшчыны. «Горад Зэра» — двайнік сучаснай Беларусі. Фільм дэманструецца 26 кастрычніка.

2 лістапада гледачоў чакае рарытэт, які ў знаўцаў жанравага кіно выклікае самыя трымценныя пачуцці. Містычная стужка паводле апавядання Аляксандра Грына «Спадар афармляльнік» (1988 год) Алега Цяпцова даўно заслужыла славу аднаго з самых дзіўных фільмаў. Дэкадэнцкае афармленне стужкі, гіпнатычны акцёр Віктар Авілаў (які ў той час уцякаў ад раку) і фантасмагарычная музыка Сяргея Курохіна — пазачасавыя.

9 лістапада — энігматычная карціна Аляксандра Сакурава «Дні зацмення» (1988 год) — паводле фантастыкі братоў Стругацкіх. Карціна адметная медытатыўнай манерай і гукавым шэрагам.

Усе стужкі дэманструюцца а 19.00.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# АД ЯРАША І АКСАНЫ З ЛЮБОЎЮ!

**Анатоль МЯЛЬГУЙ**

**Ужо чацвёрты сезон паэтычны тэатр «Арт.С» (art-s.by) запрашае на свае вечарыны ўсіх прыхільнікаў нацыянальнай культуры. «Фірмовыя» літаратурна-музычныя імпрэзы тэатра адбываюцца пры поўным аншлагу ў сталічнай бібліятэцы імя Цёткі. Не выключэннем стала і нядаўняя сустрэча аматараў беларускай музыкі і літаратуры, якая была прымеркавана да выхаду ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» дзіцячай «Незвычайнай энцыклапедыі беларускіх народных інструментаў». Гасцямі яе сталі аўтары кнігі — муж і жонка Яраш Малішэўскі і Аксана Спрынчан.**


Яраш Малішэўскі і Аксана Спрынчан

Тэма выдання аўтарамі выбрана невыпадкова: Яраш Малішэўскі — калекцыянер старажытных беларускіх інструментаў, гісторык і фолк-выканаўца, вядомы слухачам па ўдзелу ў гуртах «Pete Paff» і «P.L.A.N.». Муза Яраша — жонка і, па сумяшчальніцтву, суаўтар «Незвычайнай энцыклапедыі...» Аксана Спрынчан — знаная паэтка і аўтар шматлікіх зборнікаў, якія прынеслі ёй вядомасць у айчыннай літаратуры.

Плод іх сумесных творчых намаганняў — «Незвычайная энцыклапедыя беларускіх народных інструментаў» — з'яўляецца, па сутнасці, першым у краіне сістэматызаваным выданнем для дзяцей, у якім у паэтычна-казачным ключы распавядаецца пра шматлікія народныя музычныя інструменты: ад жалейкі да леры, ад цымбалаў да дуды з басэтляй... Прытым аўтары прыводзяць не толькі фактычныя дадзеныя, але і паэтызаваныя легенды пра ўзнікненне таго ці іншага інструмента. Каляровым дадаткам да звестак і паэтычных легенд Я. Малішэўскага і А. Спрынчан з'яўляюцца ілюстрацыі да «Энцыклапедыі...», якія таленавіта стварыла Вераніка Шніп.

Дарэчы, Вераніка прадэманстравала яшчэ адзін свой талент — музыканта, калі выступіла перад наведвальнікамі прэзентацыі з складзе рок-гурта «SCALES». Дачку Вераніку падтрымалі і бацькі юнай мастачкі — паэтычны дуэт Віктара Шніпа і Людмілы Рублеўскай. Жывыя класікі сучаснай беларускай паэзіі парадавалі слухачоў цудоўнымі паэтычнымі радкамі, якія яны ў розныя часы прысвяцілі вечнай музычнай тэме. Гэта тэма па-свойму хвалюе і айчынных казачнікаў: прадстаўніца «казачнага цэха» айчыннай літаратуры Алена Масла прысвяціла свой твор цудам, якія творыць Музыка.

Расповед пра ідэю і працэс стварэння «Незвычайнай энцыклапедыі беларускіх народных інструментаў» аўтары выдання пабудавалі ў форме сямейнага дыялогу, калі Яраш і Аксана дапаўнялі сваімі думкамі і ўспамінамі чытанне паэтам Зміцерам Арцюхом асобных артыкулаў «Незвычайнай энцыклапедыі...». Галоўнымі дзеючымі «асобамі» вечарыны сталі ўсё ж беларускія народныя інструменты, якія ў выкананні свайго ўладальніка — Яраша Малішэўскага — прагучалі ў гэты вечар. Слухачы бурнымі воплескамі сустракалі і простыя народныя найгрышы на жалейцы, парных дудках, і лірніцкія балады, кшталту старажытнай «Рыцара Байды», якую так пранікнёна выканаў Я. Малішэўскі.

Многія ўдзельнікі прэзентацыі гэтага выдання (у тым ліку аўтар гэтых радкоў і яго пастаянны vis-a-vis, музычны крытык В. Мартыненка) адзначалі арганічную сувязь «Незвычайнай энцыклапедыі беларускіх народных інструментаў» і толькі што выдадзенага З. Сідаровічам, Т. Матафонавай і іх дзецьмі Адсём і Тамашом «Дзіцячага альбому». Абодва гэтыя выданні — кнігу і дыск — можна выкарыстоўваць у якасці рэпертуарных і метадалагічных дапаможнікаў на ўроках спеваў ці ў працэсе хатняй музычнай адукацыі ў беларускамоўных сем'ях.

Як пацвярджэнне гэтых слоў, на прэзентацыі прагучалі некалькі твораў з «Дзіцячага альбома» з выкарыстаннем дуды і скрыпкі, пра якія так цікава распавядаецца ў «Незвычайнай энцыклапедыі беларускіх народных інструментаў». Асабліва шчыра слухачамі была прынята адна з песень «Дзіцячага альбому» — полька-прыпеўка «Рыба з ракам», якая так хораша прагучала ў перакладзе для звонкіх галасоў Адася і Тамаша.

Музычную эстафету праекта «Дзіцячы альбом» падхапілі больш сталыя артысты — удзельнікі літаратурна-музычнага гурта «Жаба ў каляіне». Гэта музычная суполка ў складзе вядомага ў паэтычных колах Мюра Фарыдовіча і гітарыста Максіма Іўкіна прапанавалі слухачам кароткія музычныя спектаклі паводле твораў класікаў айчыннай паэзіі. Сюрпрызам ад «Жабы ў каляіне» стала феерычна-музычнае прачытанне артыкула з «Незвычайнай энцыклапедыі...» «Цымбалы», у якім бліскуча выканала партыю гэтага інструмента Надзея Каракулька.

Безумоўна, «Незвычайная энцыклапедыя беларускіх народных інструментаў» будзе мець поспех у чытачоў розных узростаў. Выданне паслужыць мэце музычнага выхавання нашых дзетак. Але каб яго мэты былі дасягнуты больш вынікова, патрэбна, каб «Незвычайная энцыклапедыя...» была дапоўнена не толькі змястоўна, але і мела аўдыё- і відэа-дадатак у выглядзе DVD-дыску з запісамі гучання інструментаў, пра якія ідзе размова ў кнізе. Зрэшты, па словах аўтараў, выданне будзе мець працяг. А значыць, ёсць надзея, што нашы заўвагі будуць улічаны ў новых тамах гэтага карыснага даведніка.

## ВЫСТАВЫ

### ГЕРБАРЫЙ ЧАСУ

**У Музеі сучаснага мастацтва з 12 па 30 кастрычніка свае жывапісныя і графічныя работы на выставе «Гербарый часу» дэманструюць чатыры выпускніцы Акадэміі мастацтваў 2000-х гадоў.**



У маладых мастачак Ірыны Ясюкайць-Дударавай, Таццяны Грыневіч, Таццяны Казанцавай і Соф'і Піскун, як высвятляецца, хапае і абсалютна дарослага майстэрства, і густу, і здольнасці выступіць прадуманым калектыўным праектам, каб безумоўна «перамагчы» па якасці размешчаную ў гэтым жа музеі экспазіцыю «SOS» старэйшых калег з суполкі «Арцель». Магчыма, гэта прадказальна: маладыя могуць заявіць пра сябе толькі безумоўнай дасканаласцю сваіх прац. «Адбіткі, адлюстраванні, спыненыя імгненні» — знакі часу, падзей, успамінаў — праз тонкія, часам размытыя і няпэўныя формы і вобразы маладыя мастачкі ствараюць кожная свой непаўторны свет пачуццяў і эмоцый, які заваблівае гледача бясконцай разнастайнасцю магчымых асацыяцый. Заваблівае ў гульню фантазіі.

У Таццяны Грыневіч — больш зыбкія, паэтычныя жывапісныя формы і пераасэнсаваныя цытаванні класікі авангарду XX стагоддзя — дзесьці паміж Лентулавым і Шагалам віцебскага перыяду, у Ірыны Ясюкайць-Дударавай аб'екты адлюстравання вылепленыя больш пэўна і адчувальна, але пагружаныя ў флёр пазачасавай і пазапрасторавай атмасферы. Яны, як і стылі дзвюх іншых дзяўчат у графіцы, — выразна персанальныя.

Таццяна Казанцава эксперыментуе з манахромнай акварэллю, надаючы выяве якасці амаль афортнага адбітку. У той час як Соф'я Піскун уводзіць у графіку паэтычныя радкі на нямецкай і беларускай мовах. Відаць, падобны стыль вельмі б дапасаваўся да ілюстравання невялікіх па-эстэцку вытанчаных паэтычных кніжачак. Адным словам, з выставы дакладна маем некалькі новых імёнаў, якія наўрад ці згубяцца ў будучым мастацкім жыцці краіны.

### ФАТОГРАФ СВАЙГО ЧАСУ І ЦЕНЬ ІЕРУСАЛІМА

**У Нацыянальным гістарычным музеі дзве фотаэкспазіцыі, якія цалкам заслужана прыцягваюць вялікую ўвагу наведвальнікаў.**




Вельмі да месца па профілі музея трапіла экспазіцыя «Фатограф свайго часу» (з 21 верасня па 31 кастрычніка), прысвечаная 120-годдзю старэйшага беларускага фотамайстра Ісака Восіпавіча Салавейчыка (1890–1967).

Адзін з заснавальнікаў самага вядомага ў Беларусі фотаклуба «Мінск» (1960) Салавейчык — патомны фатограф. Яго дзед Якаў (памёр у 1881 годзе), нясвіжскі месціч, трымаў фотаатэлье ў Слоніме, Пружанах, Гродна, бацька Восіп — у Гродна і Беластоку, дзе і нарадзіўся герой выставы. Яго біяграфія звязана з першымі ілюстраванымі беларускімі часопісамі 1930-х, афармленнем прамысловых і сельскагаспадарчых выстаў у Мінску і Маскве, першымі курсамі фотамастацтва і гурткамі аматараў фота ў Віцебску і Мінску. Вельмі плённы перыяд творчасці — праца ў газеце «Літаратура і мастацтва» ў 1952–1960 гадах і фатографам Нацыянальнага мастацкага музея.

На здымках Салавейчыка — мастакі і скульптары Волкаў, Герус, Бембель, літаратары Мележ і Крапіва, Макаёнак за чытаннем п'есы ў Купалаўскім тэатры (толькі нядаўна купалаўцы зноў пачалі вяртацца да гэтай плённай традыцыі аўтарскага прэзентавання тэкстаў). Першыя фотамантажы і гумарыстычныя віншавальныя фотапаштоўкі. Замалёўкі з штодзённага (неплакатнага) жыцця краіны 1930–1960-х гадоў. І, што цікава для гістарычнай рэтраспектывы фотасправы ў Беларусі, паказаны некалькі работ атэлье дзеда і бацькі Ісака Салавейчыка.

Размешчаная ў вялікай экспазіцыйнай зале Нацыянальнага гістарычнага музея, падрыхтаваная пасольствам Ізраіля выстава «Цень Іерусаліма» з 13 па 31 кастрычніка прапануе эфектныя натурныя здымкі старадаўняй сталіцы трох рэлігій, непараўнальныя краявіды Мёртвага мора, знакамітага Кумранскага плато.




Работы выкананы эмігрантам з Украіны Леанідам Падрулем, сталым фатографам «National Geographic», што і абумоўлівае панарамна-фактурную прыгажосць яго па-часопіснаму эфектных работ. Ёсць і спецыяльныя тэмы — старыя святыні Іерусаліма, уключаючы Храм Труны Гасподняй, вобразы старых «кашэрна-пейсатых» габрэяў, «біблейскага народу».

### ШКАЛА РЫХТАРА

**У Галерэі «Ў» пасля пераезду калектыву яе экспазіцыянераў з памяшкання «Падземкі» ў новыя прыгожыя інтэр'еры бліжэй да Плошчы Перамогі не ўсе праекты атрымліваюцца раўназначныя.**

Магчыма, страцілася прыцягальнасць камернасці і непасрэднасці, паболела гламурнай пафаснасці. Але задума выставы «Шкала Рыхтара» (экспануецца з 8 па 25 кастрычніка) Руслана Вашкевіча з адзінай у некалькі паасобных экспазіцыйных стэндах кампазіцыяй «Жанчына з парасонам», падкупляе цэласнасцю вобразнага мінімалізму. Адлюстраванне жанчыны драбіцца і змяняецца ў выстаўленых геаметрычна роўным шэрагам паверхнях. Як, падобна ў прызме ці ў калейдаскопе, дробяцца і перамешваюцца нашы ўспаміны і ўражанні, мінулае і сённяшняе, спараджаючы спецыфічную гульню свядомасці і фармуючы ўяўленне пра навакольны свет.

Канцэпцыя пабудавана на ідэі «false recognitin» («памылковага пазнавання»), распрацаванай у кнізе філосафа Анры Бергсона (1859–1941) «Памяць пра сапраўднасць і памылковае пазнаванне» (1908). «Памылковае пазнаванне» — з'ява, падобная да феномена «дэжавю», толькі мацнейшая, калі ў чалавека з'яўляецца адчуванне, быццам ён не проста перажывае бачанае раней, але пазнае цэлую паслядоўнасць падзей. Выстава — як лабараторны эксперымент па аналізе механізмаў успрымання і чалавечай памяці, якая пераплятае «новае» і «старое» ў сучаснасці.

**Падрыхтаваў Аляксей Хадыка**

НОВЫ СЕЗОН

# МУЗЫКА ГРУНВАЛЬДА

Аляксей ХАДЫКА

**24 кастрычніка ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі «Класік-Авангард» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава адчыняе канцэртны сезон праграмай, прысвечанай слаўнай гісторыі Грунвальдскай бітвы.**

У выкананні калектыву пры ўдзеле Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы пад кіраўніцтвам Людмілы Яфімавай прагучаць гімн «Багародзіца», «Малітвы перад Грунвальдскай бітвай» Г. Гарэлавай, «Песні даўнейшых ліцьвінаў» В. Кузняцова, сюіта «Грунвальд–1410» У. Байдава. Цяжка ўявіць: у 1529 годзе тэкст «Багародзіцы» на старабеларускай мове быў змешчаны ў першай рэдакцыі Статута ВКЛ, што ёсць сведчаннем асаблівай запатрабаванасці, нават знакавасці твора. Пад назвай «Песнь о велебной девици панне Марии». Песня, малітва, гімн трапіла ў канстытуцыю дзяржавы.

«Багародзіца», вельмі папулярная і ў Польшчы, таксама даўно адаптавана да культуры нашых суседзяў і лічыцца «найстарэйшай польскай рэлігійнай песняй». Там яна гучыць на святах і ў касцёлах, яе спяваюць рыцарскія клубы. У польскіх дакументах і выданнях тэкст твора з'явіўся напачатку XV стагоддзя, але яго першыя куплеты, верагодней, датуюцца нават канцом XIII стагоддзя, яшчэ часамі сярэднявечча. І паходзіць ён з памежжа культур, бо пісаўся на лацінскай мове з уплывамі грэчаскай і царкоўнаславянскай. Выконвалася песня спачатку падчас службаў, а ўжо ў XV стагоддзі стала рыцарскай і гучала перад бітвамі і ў час каранацый.

Старабеларускі тэкст быў упершыню надрукаваны ва ўзгаданым Статуце, у 1529 годзе. Тады ж у кастрычніку 9-гадовы Жыгімонт II Аўгуст, сын Жыгімонта I Старога, быў абвешчаны на сойме ў Вільні вялікім князем ВКЛ. «Багародзіца» зрабілася гімнам і для беларусаў, і, выходзячы на палі Грунвальда, шыхты нашых продкаў, магчыма, спявалі яе не толькі на латыні. У наш час да харавога канцэртнага выканання гімн гучаў у версіях гурта «Стары Ольса» і хору «Унія».

Па словах стваральніцы канцэпцыі праграмы, вядомага гісторыка музыкі Святлены Немагай, яе ідэя першапачаткова фармавалася вакол твора Уладзіміра Байдава «Грунвальд–1410», задуманага як музычна-літаратурная містэрыя. Сваімі вобразамі, мелодыкай і спосабам выканання сюіта мусіць пагрузіць слухачоў у атмасферу эпохі, паказаўшы сучаснае бачанне беларускім кампазітарам даўніх падзей. Некалькі стагоддзяў таму музычныя прадстаўленні фармаваліся вакол выступу акцёра, які ў паўзах паміж паасобнымі нумарамі выступаў з драматычнымі інтэрмедыямі.

Падобная сцэнічная традыцыя захоўвалася аж да часоў Грыга: як музычна-літаратурны спектакль прадстаўлялі знакамітага «Пер Гюнта». Але ў поўным фармаце, працягласцю каля 2 гадзін, твор Байдава будзе вынесены на сцэну праз некалькі месяцаў. 24 кастрычніка прагучаць толькі музычныя часткі, якія таксама маюць гістарычную канву: «Бітва», «Кароль і манах» (супрацьстаянне ордэну), «Плач княгіні Ганны, жонкі Вітаўта», «Малітва белагаловых», «Рэквіем» — дзе, між іншым, закладзены і агульначалавечы антываенны настрой. Іншыя творы праграмы мусяць сучаснымі мастацкімі сродкамі ў рэчышчы нацыянальнай культурнай спадчыны паспрыяць увасабленню духа падзей і часу Грунвальда.

КНІГА

## У ПОШУКАХ СТРАЧАНАГА

Калі гаворка заходзіць пра аўтабіяграфію, мы заўсёды ўяўляем савецкія «палову аркуша пра сябе».

Брашура маладога гісторыка і журналіста Аляксея Шалахоўскага «Польскі кавалер» не падыходзіць пад гэта вызначэнне не толькі таму, што складаецца аж з 20-ці старонак. Проста гэты расповед, хоць і біяграфічны па сутнасці, усё ж не падобны на шматлікія модныя сёння «SV», бо ў ім ёсць не толькі «голыя» факты, але і эмоцыі.

Адзін з эпізодаў тычыцца роднай вёскі аўтара Развадава, што знаходзіцца ў Клічаўскім раёне Магілёўскай вобласці.

«У вёсцы Развадава засталіся 8 старых — трое мужчын і пяць жанчын…

Краму ўжо даўно разабралі на дровы, і яна не існуе. Ферму разбурылі, і цялят ніхто даўно ніхто не гадуе. Палі пустуюць. Няма каму і што сеяць, плошчу засаджваюць лесам».

Каментаваць тут нешта няма ніякага сэнсу, бо кожны з нас можа дадаць свае ўражанні. А «Польскі кавалер» — не таму, што тут ёсць нейкія шляхецкія карані, а таму, што ў гэтых словах ёсць шчырая настальгія па незваротна страчаным.

**Аляксандр Тамковіч**

## НЕВЯДОМАЯ ГІСТОРЫЯ




19 кастрычніка ў кнігарні «Кніжны салон» на Калініна, 5 у Мінску прайшла прэзентацыя кнігі Анатоля Тараса «Костел в нашей жизни», якая выйшла ў яго серыі «Неизвестная история».

Як паведаміў прысутным аўтар, інфармацыйнай нагодай да падрыхтоўкі выдання зрабіўся 100-гадовы юбілей мінскага касцёла Святых Сымона і Алены, які будзе адзначацца 21 лістапада. Таму вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы выдання — асабліва ў падборы матэрыялаў, якія датычаць гісторыі Чырвонага касцёла і дзейнасці яго парафіі, — аказаў пробашч мінскага храма Уладзіслаў Завальнюк. 102 старонкі тэксту ў добра ілюстраванай кнізе, аднак, прысвечаны шырэйшаму колу пытанняў.

Па-першае, гісторыі ўсіх каталіцкіх храмаў і кляштараў Мінска. Па-другое, у выданні падрабязна распавядаецца пра будаўніцтва Чырвонага касцёла, драматычныя падзеі з жыцця сям'і яго фундатара Эдварда Вайніловіча. Нарэшце, А. Тарас расказвае пра адраджэнне культавага будынка пасля дзесяцігоддзяў занядбання.

**Аляксей Хадыка**




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1056

Падпісана да друку 22.10.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.